© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

ГАЗЭТА БЕЛАРУСАЎ У ВОЛЬНЫМ СЬВЕЦЕ ЦАНА — PRICE ¢ 50

Беларус

BIELARUS — BYELORUSSIAN NEWSPAPER IN THE FREE WORLD
POST ADDRESS: BIELARUS, P. O. BOX 109, JAMAICA, N. Y. 11431, Tel.: AX 1-8038

Год XXI. № 170 Нью Ёрк June — Чырвень — 1971 New York Yol. XXI. № 170

АДНА ІЗЬ ЗЬЯВАЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГЭНАСЫДУ

Пытаньне выдавецкіх цяжкасьцяў для твораў мастацкай, літаратураведна-крытычнай дый наагул беларусаведнай літаратуры ставіцца беларускай творчай інтэлігенцыяй сыстэматычна ад даўжэйшага часу, штонайменш ад 15-ёх гадоў. Агульна сьцьверджана, што творы беларускіх пісьменьнікаў і беларусаведныя працы залежваюцца ў выдавецтвах цэлымі гадамі, пакуль пабачаць сьвет, а, пабачыўшы, вельмі часта не даходзяць да чытача, бо выдаюцца ўсьцяж вельмі мізэрнымі тыражамі. У друку ціраз падаваліся факты, калі патрэбнай і цікавай кнігі, выдадзенай тыражом ад аднае да колькіх усяго тысячаў экзэмпляраў, нельга знайсьці навет у сталічных кнігарнях за тыдзень пасьля ейнага выхаду.

Заміж таго, каб пад ціскам грамадзкае думкі справа гэтая палепшылася, яна апошнімі гадамі сыстэматычна пагоршваецца. Гэта й было сьцьверджана на 6-ым зьезьдзе пісьменьнікаў Беларусі як у справаздачным дакладзе праўленьня Саюзу пісьменьнікаў, прачытаным першым сакратаром Саюзу пісьменьнікаў Беларусі Максімам Танкам, гэтак і ў дыскусіі. У справаздачным дакладзе казалася: **рэзка зьменшылася месца паэзіі ў плянах нашага выдавецтва „Беларусь". Калі ў 1967 годзе было выдадзена 32 паэтычныя кнігі, а ў 1969 — 33, то ў мінулым годзе... толькі 16. Амаль столькі-ж арыгінальных кніг паэзіі заплянавана і на сёлетні год. Па невядомай прычыне скарацілася зь пяці да аднэй кніжкі ў год „Бібліятэка беларускай паэзіі". Атрымліваецца сумны малюнак: колькасьць рукапісаў павялічваецца, паэзія і колькасна і якасна расьце, а плошча для яе друкаваньня ня толькі застаецца ранейшай, але навет скарачаецца".** У выніку гэтага, сьцьвярджалася далей у дакладзе, **„зборнікі маладых паэтаў ляжаць у выдавецтве гадамі, а ўжо вядомы, творча актыўны паэт можа выдаць у нас кнігу ў тры-чатыры гады".**

Падобнае становішча і ў галіне дзіцячай літаратуры. Пра „Школьную сэрыю" кніжак у справаздачным дакладзе сказана: **„У 1970 годзе выйшла, а на 1971 год заплянавана ўжо не па дваццаць кніжак у год, як было раней, а толькі па пяць. І гэта трывожыць. Яшчэ больш трывожыць здаецца нам тое, што ў сэрыі „Бібліятэка дашкольніка і малодшага школьніка", два гады назад запраектаванай да выданьня, ня выйшла дагэтуль яшчэ ніводнай кніжкі".**

Ня лепш і ў галіне выдаваньня працаў літаратурна - крытычных. Вось словы із справаздачнага дакладу: **„З году ў год скарачаецца колькасьць зборнікаў крытычных артыкулаў у дакладным разуменьні гэтага паняцьця. Такія зборнікі ў нас друкуе галоўным чынам выдавецтва „Беларусь", але яно ў вапошнія гады не праяўляе асаблівай прыхільнасьці да крытычнай прадукцыі. І ўжо зусім складанай праблемай зьяўляецца перавыданьне крытычнай кніжкі, калі яна даўно разышлася ці мае патрэбу ў пэўным абнаўленьні".**

А вось агульны стан выдаваньня мастацкае літаратуры, узяты разам паводля словаў справаздачнага дакладу: **„Калі ў 1968 годзе было выпушчана 130 кніг мастацкай літаратуры, то ў 1970 годзе ўсяго 102, плян 1971 году — 110. Праект пляну 72 году таксама ня вышэй... У партфэлі рэдакцыі мастацкай літаратуры маецца зараз 242 рукапісы, у праект пляну 1972 году трапілі ўсяго 75".**

Бяручы ўсё гэта на ўвагу ды сьцьвердзіўшы факт, што **„універсальнасьць выдавецтва „Беларусь" становіцца тормазам да пашырэньня выпуску мастацкай літаратуры"**, у дакладзе праўленьня было пастаўленае канкрэтнае патрабаваньне **„аб неабходнасьці стварэньня ў рэспубліцы асобнага выдавецтва мастацкай літаратуры"** з асобным штатам працаўнікоў, з асобным прыдзелам паперы і асобным бюджэтам.

Ня меншая трывога з прычыны сыстэматычнага звужаньня выдавецкіх магчымасьцяў была выказаная і ў дыскусіі зьезду. Пісьменьнік **Алесь Асіпенка** сваё выступленьне прысьвяціў цалком гэтаму пытаньню. **„Як гэта ня дзіўна, але з даволі буйным ростам пісьменьніцкіх радоў колькасьць кніг, што выдае наша выдавецтва, ня толькі не павялічваецца, а, бадай, памяншаецца"**, — пачаў сваё выступленьне Алесь Асіпенка і сьцьвердзіў, што многія з маладых пісьменьнікаў **„чакаюць сваёй першай кнігі па тры-чатыры і больш гадоў".** Ён між іншым прыгадаў, што ўжо даўно, бо яшчэ на 5-ым пісьменьніцкім зьезьдзе афіцыйна было заяўлена пра стварэньне пры часапісе „Маладосьць" бібліятэкі маладога паэты й навэліста, што ня было, аднак, зрэалізавана й да сяньня. Сьледам за Максімам Танкам ён падчыркнуў таксама ненармальную зьяву, што **„прафэсійны ўзровень выдавецкіх рэдактароў у вапошні час вельмі панізіўся, а правы іх павысіліся".**

З усіх выступленьняў у дыскусіі 16-ёх пісьменьнікаў роўна палавіна выказвала глыбокую трывогу з прычыны звужэньня выдавецкіх магчымасьцяў: апрача згаданага выступленьня Алеся Асіпенкі, прамаўлялі на гэтую тэму ды патрабавалі стварэньня адмысловага выдавецтва мастацкай літаратуры, адмысловай рэдакцыі для дзіцячай літаратуры дый наагул грунтоўнага палепшаньня выдавецкай справы яшчэ й наступныя пісьменьнікі: **Ёўдакія Лось, Павал Дзюбайла, Ніл Гілевіч, Віктар Каваленка, Васіль Вітка, Аляксандар Міронаў і Іван Мележ.**

Не зважаючы на тое, што патрабаваньні грунтоўнае зьмены выдавецкай палітыкі былі на зьезьдзе ўсеагульнымі й прагучэлі з асаблівай трывогай, першы сакратар ЦК КПБ П. Машэраў у сваёй даўжэйшай прамове ўжо пасьля згаданых пісьменьніцкіх выступленьняў, закранаючы нат зусім дробныя справы, уважаў за патрэбнае збыць гэтае кроўнае для беларускай літаратуры пытаньне поўным маўчаньнем інакш кажучы, маўкліва прызнаў сучасны выдавецкі стан за нармальны.

А прысутны на зьезьдзе прадстаўнік ураду БССР — старшыня Дзяржаўнага камітэту Савету Міністраў БССР па друку Р. Канавалаў у словах поўных цынізму заявіў на заканчэньне ўсяе дыскусіі: **„Дзякуючы штодзённым клопатам Камуністычнай партыі і ўраду БССР у нашай рэспубліцы за апошнія гады створаны спрыяльныя ўмовы для далейшага разьвіцьця кнігавыдавецкай справы. У выдавецтвах створан шэраг новых рэдакцыяў, павялічаны аб'ёмы літаратурна-мастацкіх часапісаў, паліграфпрадпрыемствы атрымалі вялікую колькасьць новай тэхнікі і гэтак далей. Выпуск мастацкай літаратуры ў рэспубліцы за пяцігодку павялічыўся як па колькасьці назваў, так і па тыражы".**

Важна, аднак, тое, што гэтая заява прадстаўніка ўраду БССР Канавалава й маўклівая згода зь ім найвышэйшага партыйнага верхавода ў Беларусі П. Машэрава ўдзельнікаў зьезду не зьбянтэжыла. Зьезд у сваёй Рэзалюцыі ўсё-ж пастанавіў: **„прымаць далейшыя захады па павялічэньні тыражоў пэрыядычных выданьняў органаў Саюзу пісьменьнікаў і кніг, пашырэньня выдавецкай справы, у прыватнасьці — стварэньня выдавецтва мастацкай літаратуры".** Трэба думаць, што гэтыя захады пісьменьнікаў будуць падхопленыя й падтрыманыя й іншымі творчымі саюзамі ды адпаведнымі культурнымі, мастацкімі й навуковымі ўстановамі Беларусі.

У чытача можа зрадзіцца натуральнае пытаньне: якую-ж мэту ставіць перад сабой Камуністычная партыя, зырка звужаючы крыўдныя й бяз гэтага выдавецкія магчымасьці для беларускае кнігі? Адказаць на гэтае пытаньне ня цяжка, калі разглядаць яго ў камплексе ўсіх зьяваў г. зв. ленінскае нацыянальнае палітыкі Камнуістычнай партыі Беларусі, галоўным заданьнем якой — **русыфікацыя.**

Выдавецтвы Беларусі зьяўляюцца дзяржаўнымі й мусяць дакладна выконваць дырэктывы партыі і ўраду. Згодна з гэтымі дырэктывамі адно каля 20% усяе кніжнае прадукцыі Беларусі выдаецца на беларускай мове, а 80% — на мове „старэйшага брата" — расейскай. Але гэтага 20-ціпрацэнтавага кантынгенту дасюль было нельга тарнаваць да твораў мастацкае літаратуры, бо беларускія пісьменьнікі пішуць вылучна пабеларуску. Але партыя, аказваецца, знайшла спосаб і на гэта — паступова, але сыстэматычна звужаць выдавецкія магчымасьці для твораў мастацкае, літаратураведна-крытычнае й наагул усякае беларусаведнае літаратуры ў беларускай мове. Некаторых катэгорыяў беларускіх кніжак ужо сяньня выдаецца ўсяго якраз 20%, раўнуючы да стану зь перад колькіх яшчэ гадоў.

Звужаючы выданьне беларускіх кніжак, Камуністычная партыя Беларусі на загад Масквы штучна спыняе й разьвіцьцё беларускае культуры, падмяняючы яе гэтак званай культурай агульнасавецкай, у тэорыі інтэрнацыянальнай, а фактычна будаванай на расейскай нацыянальнай базе ды падношанай беларускаму народу ў расейскай мове. Гэта ня што іншае, як чародны жахлівы этап **нацыянальнага й культурнага гэнасыду.**

Беларускі народ на працягу сваёй гісторыі ўжо шмат перажыў этапаў прымусовае русыфікацыі й насаджваньня бязкультур'я, перажыве й гэты этап. Але бяспрыкладнага зьдзеку Масквы ўсякіх колераў, улучна з Масквой колеру чырвонага, ніколі ёй не даруе. А час расплаты ўсё-ж некалі ды прыйдзе!

Дзівасіл

ДЭЛЕГАТ З ЭУРОПЫ

Сп. Віктар Сянькевіч, працаўнік радыё „Свабода" ў Гішпаніі й дактарант Мадрыдзкага ўнівэрсытэту, у канцы травеня сёлета прыбыў у Нью Ёрк, як дэлегат ад сэктару Рады БНР у Гішпаніі й Заходняй Нямеччыне на II-ю сэсію Рады, што адбылася 29 травеня. Побыт у Нью Ёрку сп. Сянькевіч выкарыстаў адначасна дзеля папаўненьня збору дакумэнтаў і матар'ялаў для доктарскае дысэртацыі пра пачаткі Вялікага Княства Літоўскага, а таксама дзеля азнаямленьня зь беларускім жыцьцём ды навязаньня лучнасьці з суродзічамі ў Нью Ёрку й ваколіцах.

У сыботу 6-га чырвеня сп. Сянькевіч, як сябра Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, прачытаў у Інстытуце рэфэрат на тэму „Этнічныя элемэнты пры паўстаньні Вялікага Княства Літоўскага". Ён пазнаёміў удзельнікаў паседжаньня з тэмай свае дысэртацыі ды абставінамі працы над ёю, пасьля чаго адбылася цікавая дыскусія над складанымі пытаньнямі паходжаньня й нацыянальнага характару Вялікага Княства Літоўскага.

У нядзелю 6 чырвеня сп. Сянькевіч разам із сп. Г. Паланевічам, у якога ён затрымаўшыся на час свайго пабыту у Нью Ёрку, наведалі беларускую грамаду ў Нью Брансьвіку з мэтай сустрэчы із старымі сябрамі ды новымі прыяцелямі.

Уражаньні ў нашага дарагога гасьця, як ён сказаў, вельмі дадатныя; паводля ягонага прызнаньня, ён стаўся сьветкам паважнае беларускае грамадзкае й палітычнае працы ў ЗША. Асабліва прыемна ўражаны быў ён ад наведаньня Нью Брансьвіку.

12 чырвеня сп. Сянькевіч адляцеў назад у Эўропу. Трэба спадзявацца, што ў нашага падарожніка знойдзецца вольная часіна, каб на балонах „Беларуса" падзяліцца шырэй сваймі ўражаньнямі з побыту ў беларускай Амэрыцы.

Я. З.

КАМУНІКАТ РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ

29 травеня 1971 г. у Нью Ёрку адбылася чародная II-я сэсія Рады Беларускае Народнае Рэспублікі з удзелам 65 радных. Сэсія прыняла ў склад Рады новых сяброў, праслухала справаздачы Старшыні Рады, Прэзыдыюму, Сакратарыяту й Сэктараў ды абмеркавала бягучыя палітычныя праблемы й арганізацыйныя мерапрыёмствы.

Сэсія аднагалосна абрала на становішчы Старшыні Рады БНР на наступныя 6 гадоў др. Вінцэнта Жука-Грышкевіча, а за першага заступніка Старшыні Рады БНР — др. Барыса Рагулю ды прыняла шэраг рэзалюцыяў і зваротаў.

ПЕРАД 15-МІ ЎГОДКАМІ ВУГОРСКАГА ПАЎСТАНЬНЯ

У кастрычніку сёлета спаўняецца 15 год ад гераічнага паўстаньня Вугорскага народу ў 1956 годзе супраць маскоўска-савецкага акупанта. Вугорская палітычная эміграцыя ў Вольным Сьвеце, у тым ліку й беспасярэднія змагары паўстаньня, якім пасьля крывавага здушэньня паўстаньня савецкай арміяй удалося знайсьці прыпынак на Захадзе, а таксама й палітычныя эміграцыі іншых паняволеных камуністычнымі рэжымамі народаў пачалі ўжо рыхтавацца да належнага адзначаньня гэтых угодкаў.

Ведамая міжнацыянальная арганізацыя Амэрыканцы за Вызваленьне Паняволеных Народаў супольна зь ньюёркаўскім аддзелам Сусьветнае Фэдэрацыі Вугорскіх Змагароў за Свабоду запрасілі былі на 25 травеня сёлета прадстаўнікоў эміграцыяў усіх паняволеных народаў на сяброўскае прыняцьцё й нараду ў Вугорскім Доме на Мангэтэне дзеля супольнага зарганізаваньня ўгодкавых сьвяткаваньняў у Нью Ёрку. Ад Беларусаў запрошаны быў і прыняў удзел у нарадзе Рэдактар „Беларуса" Д-р Ст. Станкевіч. Ён-жа ўвайшоў у склад зарганізаванага на нарадзе з розных нацыянальнасьцяў Камітэту Амэрыканскіх Грамадзянаў дзеля падрыхтаваньня й правядзеньня ўгодкавых урачыстасьцяў у Нью Ёрку.

У межах гэтага Камітэту былі створаныя два адмысловыя працоўныя падкамітэты: а) Падкамітэт арганізацыйна-інфармацыйны й б) Падкамітэт мастацкага фэстывалю.

Сьвяткаваньне 15-ых угодкаў Вугорскага Паўстаньня пачнецца ў сыботу 22 кастрычніка масавай дэманстрацыяй эмігрантаў паняволеных народаў і іхных амэрыканскіх прыяцеляў перад будынкам Задзіночаных Нацыяў у Нью Ёрку. Вечарам гэтага-ж дня адбудзецца ўрачысты Банкет прадстаўнікоў паасобных нацыянальнасьцяў і палітычных ды грамадзкіх колаў Амэрыканцаў. Гэткія-ж банкеты адбудуцца ў Вашынгтоне, Чыкага, Лёс Анджэлесе й Тароньце.

Нядзеля 23 кастрычніка будзе прысьвечаная Міжнацыянальнаму Фэстывалю-Конкурсу народных танцаў і песьняў розных нацыянальнасьцяў. У склад Журы конкурсу згадзіўся ўвайсьці ведамы тэлезізыйны артысты Дэд Суліван. Вечарам у нядзелю адбудзецца Ўгодкавы Сход, у мастацкай праграме якога выступяць пераможцы конкурсу народных танцаў і песьняў. Удзел у гэтым Фэстывалі-Конкурсе прымуць і Беларусы.

Ганаровы Сьвяткавальны Камітэт згадзіўся ачоліць сябра ўраду ЗША — Сакратар Транспартацыі Джон Волпі й вялікая колькасьць адказных амэрыканскіх палітыкаў і сяброў Кангрэсу ЗША.

Падаючы гэта да ведама, мы заклікаем усіх Беларусаў Нью Ёрку й аколіцаў, Чыкага, Лёс Анджэлесу й Таронта, а таксама ўсіх тых мясцовасьцяў, дзе будуць адзначаныя ўгодкі, выказаць поўную салідарнасьць зь гераічным Вугорскім Народам сваім масавым удзелам у дэманстрацыях і сходах, а таксама й належным удзелам у мастацкай праграме сьвяткаваньня..

АГУЛНЫ СХОД БАЗА Ў НЬЮ ЁРКУ

16 травеня сёлета адбыўся Гадавы Агульны Сход Ньюёркаўскага Аддзелу БАЗА.

Згодна справаздачы старшыні Аддзелу М. Кунцэвіча й сяброў Управы, на працягу мінулага году Управа прыймала актыўны ўдзел у трох вялікіх імпрэзах: у Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі, што адбывалася ў Нью Ёрку 5-7 верасьня летась, сьвяткаваньні ўгодкаў Акту 25 Сакавіка і ў падрыхтоўцы й дапамозе Галоўнай Управе БАЗА ў 14-ым Кангрэсе БАЗА.

У ліпені летась Управа Аддзелу прыймала актыўны ўдзел ува ўсіх імпрэзах Тыдня Паняволеных Народаў у Нью Ёрку, а 1-га травеня сёлета — Парадзе Ляяльнасьці. У сьнежні летась разам із Задзіночаньнем Беларускіх Вэтэранаў зладзіла сьвяткаваньне ўгодкаў Слуцкага Паўстаньня, спалучанага з ушанаваньнем памяці ген. Кастанціна Езавітава з дакладам пра яго сп. Пётры Мірановіча.

Калі ходзіць пра імпрэзы сяброўскага характару, дык ладзіліся сьвяты Дажынкаў, Запусканў і Сустрэча Новага Году. У культурна-асьветнай галіне адбыліся дзьве зборкі з рэфэратамі Д-ра Я. Станкевіча зь гісторыі Беларусі. Кажную нядзелю ў памешканьні Беларускага Грамадзкага Цэнтру ў Брукліне працавала кіраваная Аддзелам Беларускага Школа.

Ацаніўшы пазытыўна праробленую дзейнасьць, Сход на прапанову Рэвізійнае Камісіі прызнаў Управе Аддзелу абсалюторыюм з падзякай.

На Сходзе былі выбраныя дэлегаты на 14-ы Кангрэс БАЗА, а таксама новая Управа Аддзелу, у якую ўвайшлі: Мікалай Кунцэвіч — старшыня, Уладзімер Русак — віцэ-старшыня, Валентын Міцкевіч — скарбнік, Галіна Орса — сакратар, Міхась Тулейка — культурны рэфэрэнт, Раіса Станкевіч — рэфэрэнт сувязі з моладзяй, Натальля Орса — сябра Управы.

АГУЛЬНЫ ГАДАВЫ СХОД БАЗА Ў КЛІЎЛЕНЬДЗЕ

9 травеня сёлета адбыўся Гадавы Агульны Справаздачна-Перавыбарны Сход сяброў Аддзелу БАЗА ў Кліўленьдзе. У Прэзыдыюм Сходу былі выбраныя К. Кіслы — старшыня і Ул. Дунец — сакратар. У склад новае Управы Аддзелу БАЗА выбраныя: Ул. Дунец — старшыня, А. Стрэчань — віцэ-старшыня, А. Яраховіч — скарбнік, І. Калядa-Сьмірнова — сакратар, К. Кіслы — культурны рэфэрэнт, Я. Раковіч — рэфэрэнт вонкавых дачыненьняў, В. Лукашэвіч — сябра Управы. У Рэвізійную Камісію ўвайшлі: Я. Каваленка, а. М. Страпко, С. Полацкі.

Вышла з друку скарынінская ўгодкавая
КНІГА 5-ая

ЗАПІСАЎ

Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва.
У кнізе каля 30 ілюстрацыяў, дзьве зь іх каляровыя.
Цана кнігі 5.00 даляраў.
Выпісваць на адрыс:
Whiteruthenian Institute
3441 Tibbett Avenue
Bronx, N. Y. 10463, U.S.A.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

BIELARUS

Byelorussian Newspaper in the Free World
Published monthly by
BYELORUSSIAN-AMERICAN ASSOCIATION, Inc.,

Subscription $ 6.00 yearly.

„БЕЛАРУС" — Газэта Беларусаў у Вольным Сьвеце
Выходзіць месячна. Рэдагуе Калегія.
Выдае: Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне
Выпіска зь перасылкаю — 6 дал. на год.
Незамоўленыя рукапісы назад не зьвяртаюцца.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ РАДА НАЦЫЯНАЛЬНАСЬЦЯЎ

Рэспубліканскі рух нацыянальнасьцяў або, як іх афіцыйна называюць, спадчынных групаў, арганізацыйна выяўляўся дасюль у лякальных і штатавых рэспубліканскіх клюбах паасобных нацыянальнасьцяў ды ў цэнтральных (нацыянальных) камітэтах або фэдэрацыях гэтых нацыянальнасьцяў. Апрача гэтага, у паасобных штатах ЗША паўсталі міжнацыянальныя штатавыя рэспубліканскія фэдэрацыі.

Дзеля каардынаваньня й пашыраньня рэспубліканскага руху нацыянальнасьцяў пры Цэнтральным (Нацыянальным) Рэспубліканскім Камітэце ў Вашынгтоне пасьля перамогі Рэспубліканскае Партыі на апошніх прэзыдэнцкіх выбарах быў створаны адмысловы Аддзел Нацыянальнасьцяў або Спадчынных Групаў на чале зь ягоным Дырэктарам Ляшлё С. Пастарам (Вугорац). Аддзел гэты дзеля сталае сувязі з паасобнымі нацыянальнасьцямі назначыў зь іхных радоў сваіх сталых дараднікаў-кансультантаў, якім ад Беларусаў назначаны Д-р Станіслаў Станкевіч.

Камітэт Дараднікаў, які твораць дараднікі ўсіх нацыянальнасьцяў, на сваім паседжаньні ў Вашынгтоне ў кастрычніку летась вынес пастанову, што, апрача Аддзелу Нацыянальнасьцяў у рамах Цэнтральнага Рэспубліканскага Камітэту, дзеля кіраваньня й каардынаваньня руху нацыянальнасьцяў павінна быць створаная із саміх нацыянальнасьцяў сталася Рэспубліканская Рада Нацыянальнасьцяў, як дарадны орган пры Цэнтральным Рэспубліканскім Камітэце.

Гэтая пастанова прыхільна была прынятая Цэнтральным Рэспубліканскім Камітэтам. Дзеля выбараў кіраўнічных органаў сталае Рэспубліканскае Рады Нацыянальнасьцяў, прыняцьця ейнага статуту, палітычнае плятформы й пляну дзейнасьці і быў скліканы ў Вашынгтоне 21-23 травеня сёлета трохдзённы першы Зьезд Рады Нацыянальнасьцяў. У Зьезьдзе прыняло ўдзел больш за 300 прадстаўнікоў ад паасобных 31-ае нацыянальнасьцяў з 21 штату ЗША, зь якіх афіцыйных дэлегатаў з правам голасу было 166, астатнія — былі іхныя заступнікі й госьці. Колькасьць дэлегатаў з правам голасу й іхных заступнікаў з дарадчым голасам была вызначаная для кажнае нацыянальнасьці паводля колькасьці ейных штатавых рэспубліканскіх клюбаў. У залежнасьці ад гэтага, Беларусам было прызнана права мець трох дэлегатаў і трох заступнікаў. Пэрсанальна беларускую дэлегацыю складалі: дараднік Аддзелу Нацыянальнасьцяў **Д-р Станіслаў Станкевіч** — старшыня дэлегацыі; старшыня Беларуска-Амэрыканскага Рэспубліканскага Клюбу штату Нью Ёрк **Барыс Данілюк,** сябра Управы гэтага Клюбу — **Д-р Расьціслаў Гарошка** і старшыня Беларуска-Амэрыканскага Рэспубліканскага Клюбу штату Огаё **Янка Раковіч** — сябры дэлегацыі.

Працы Зьезду пачаліся 21 травеня вечарам паседжаньнем Камітэту Дараднікаў, на якім былі падрыхтаваныя арганізацыйна-тэхнічныя пытаньні Зьезду ды выбраныя паасобныя Камісіі Зьезду. Пасьля гэтага адбыліся паседжаньні паасобных Камісіяў, на якіх былі апрацаваныя праекты пастановаў і рэзалюцыяў Зьезду. Беларускія дэлегаты былі сябрамі наступных Камісіяў: Камісіі вонкавых дачыненьняў — Д-р Р. Горашка, Камісіі нутраных справаў — Янка Раковіч, Камісіі справаў партыі — Барыс Данілюк.

Першая палавіна наступнага дня — 22 травеня — была прысьвечаная пленарным дэбатам, а другая палавіна дня — выбарам кіраўнічых органаў сталае Рэспубліканскае Рады Нацыянальнасьцяў у ліку 13-ёх асобаў ад 12-ёх нацыянальцяў зь 10-ёх штатаў ЗША: Старшыня Рады Нацыянальнасьцяў — Ляшлё С. Пастар (Вугорац, Пэнсыльвэнія), першы віцэ-старшыня — Піліп Гуарыно (Італьянец, Мэрылэнд), першы віцэ-старшыня ад жанчынаў — Ганна Шэно (Кітайка, Вашынгтон), віцэ-старшыні з паасобных геаграфічных раёнаў ЗША: Мірон Курапас (Украінец, Іліной), Джон К. Лёпэз (Амэрыканскі Мэксыканец, Каліфорнія), Стафан Маркоўскі (Паляк, Нью Ёрк), Ралф Пэрк (Чэх, Огаё), сакратар — Д-р Джон Гэныс (Літовец, Мэрылэнд), скарбнік — Мануэль Гібэрга (Кубінец, Вашынгтон); у Кантрольную Камісію былі выбраныя: Д-р Лібор Бром (Чэх, Колёрадо), Курт Кэйдэль (Немец, Мічыган), Маты Коіва (Эстонец, Канэктыкат), Д-р Язэп Паўчо (Славак, Пэнсыльвэнія).

Гэткім парадкам, у кіраўнічыя органы сталай Рэспубліканскай Рады Нацыянальнасьцяў зусім натуральна ўвайшлі прадстаўнікі найлепш зарганізаваных нацыянальнасьцяў у межах Рэспубліканскае Партыі. Нам Беларусам, што яшчэ й дасюль ня маем сваёй цэнтральнай (нацыянальнай) рэспубліканскай фэдэрацыі або камітэту ды ў часе Зьезду маглі рэпрэзэнтаваць адно чатыры беларускія штатавыя рэспубліканскія клюбы, нельга было й думаць, каб правесьці свайго прадстаўніка ў кіраўнічыя органы Рады.

Трэйці дзень Зьезду — 23 травеня — быў прысьвечаны абмеркаваньню й прыняцьцю Статуту Рады й падрыхтаваных у камісіях пастановаў і рэзалюцыяў. Рэзалюцыяў было шмат і ўсе яны выражалі становішча Рэспубліканскае Рады Нацыянальнасьцяў у прынцыповых пытаньнях замежнае й нутранае палітыкі ЗША. У Рэзалюцыі ў справах вонкавых дачыненьняў быў уведзеным наступны пункт: **„Першы Зьезд Рэспубліканскае Рады Нацыянальнасьцяў уважае неабходным увядзеньне беларускае мовы ў радыяперадачах Голасу Амэрыкі".** Праект гэтага пункту сфармуляваў і падаў сябра Камісіі вонкавых дачыненьняў Д-р Р. Гарошка. Праект гэты быў **аднагалосна** прыняты на Камісіі й на пленарным паседжаньні Зьезду. Сябра Камісіі для справаў партыі Барыс Данілюк запрапанаваў увесьці ў Рэзалюцыю пункт, каб Рэспубліканская Партыя й тым самым Урад ЗША шырэй ішоў напярэймы жыцьцёвым патрэбам паасобных нацыянальнасьцяў. Праўда, на Камісіі ў справах партыі праект гэты прыняты ня быў, затое быў ён прыняты ў Рэзалюцыі Камісіі нутраных справаў і пленумам Зьезду.

У сыботу 22 травеня Старшыня Цэнтральнага Камітэту Рэспубліканскае Партыі Сэнатар Боб Даль выдаў у гонар удзельнікаў Зьезду Банкет, на якім выступіў з абшырнай прамовай, а тады фатаграфаваўся з групамі ўдзельнікаў Зьезду (фото зь беларускімі дэлегатамі будзе зьмешчанае ў наступным нумары „Беларуса"). Другую прамову сказаў нядаўна назначаны Прэзыдэнтам ЗША адмысловы прадстаўнік да справаў нацыянальнасьцяў Рэспубліканскага Камітэту кангрэсмэн Эдвард Дэрвінскі. Апрача іх, у розных мамэнтах Зьезду выступалі з дакладамі й прывітальнымі прамовамі першы віцэ-старшыня Цэнтральнага Рэспубліканскага Камітэту Том Івэнс, заступнік старшыні Камунікацыі Лін Нофцігэр, спэцыяльны дараднік Прэзыдэнта ЗША Гары Дэнт, Асыстэнт кадраў у Белым Доме Ален Каўпінэн, Асыстэнт Сакратара Фінансаў Эўджэн Росідэс, Асыстэнт Сакратара Транспарту Гэрбэрт дэ Сімонэ й інш. Прэзыдэнт Рычард Ніксан прыслаў Зьезду пісьмовае прывітаньне.

На заканчэньне застаецца адно пажадаць, каб Беларускія Рэспубліканцы больш і лепш зарганізаваліся, стварылі свае рэспубліканскія клюбы ў тых штатах, дзе іх няма яшчэ, а ёсьць дзеля гэтага магчымасьці, ды, — і гэта найважнейшае, — каб як найхутчэй заснавалі свой цэнтральны агульнаамэрыканскі Рэспубліканскі Камітэт ці Фэдэрацыю. Толькі пры гэткіх перадумовах мы зможам мець належную ўдзельную вагу ў шматнацыянальнай рэспубліканскай сям'і ды эфэктыўна выкарыстоўваць наш рэспубліканскі рух для беларускіх нацыянальных справаў.

Ст. Станкевіч

14-ТЫ КАНГРЭС БАЗА

У нядзелю 30 травеня сёлета адбыўся ў Нью Ёрку, у залі Беларускага Грамадзкага Цэнтру ў Брукліне, чародны 14-ы Кангрэс Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня. У Кангрэсе прынялі ўдзел выбраныя на агульных сходах аддзелаў БАЗА дэлегаты. Апрача іх, правамоцнымі ўдзельнікамі Кангрэсу згодна статуту былі сябры Галоўнае Управы БАЗА й Рэвізійнае Камісіі ды старшыні Аддзелаў. Гэткім парадкам, Кангрэс складаўся з дэлегатаў Нью Ёрку, Нью Джэрзі, Кліўленду (Огаё), Дэтройту (Мічыган) ды Лёнг Айлэнд (Нью Ёрк).

У Прэзыдыюм Кангрэсу былі выбраныя дэлегат ад Дэтройту Юрка Мазура — старшыня, дэлегат ад Нью Ёрку Уладзімер Русак — віцэ-старшыня, старшыня Аддзелу БАЗА ў Кліўленьдзе Уладзімер Дунец і дэлегатка ад Нью Ёрку Вера Бартуль — сакратары.

Пасьля адчыненьня Кангрэсу старшынём Галоўнай Управы БАЗА інж. Вячаславам Станкевічам ды малітвы Уладыкі Мікалая, Кангрэс хвілінаю цішыні ўшанаваў памяць памерлых у міжкангрэсавым пэрыядзе Прэзыдэнта Рады БНР Міколы Абрамчыка, Архіяпіскапа БАПЦ Васіля, Галоўнага Кіраўніка Задзіночаньня Беларускіх Вэтэранаў генэрала Франьцішка Кушаля і ўсіх памерлых сяброў БАЗА.

Кангрэс прывіталі кароткімі прамовамі старшыня Рады БНР Д-р Вінцэнт Жук-Грышкевіч, Япіскап БАПЦ Мікалай, інж. Мікалай Гарошка ад Фундацыі імя Пётры Крэчэўскага, д-р Янка Запруднік ад Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва, д-р Янка Станкевіч ад Навуковага Таварыства Франьцішка Скарыны, д-р Уладзімер Бакуновіч ад Парахвіі БАПЦ Сьв. Духа ў Дэтройце, д-р Раіса Жук-Грышкевіч ад Галоўнай Управы Згуртаваньня Беларусаў Канады.

Пасьля гэтага пачалася працоўная частка Кангрэсу. Справаздачу зь дзейнасьці Галоўнай Управы БАЗА за двугадовую ейную кадэнцыю зрабіў ейны старшыня інж. Вячаслаў Станкевіч, зь фінансавага стану — скарбнік Браніслаў Даніловіч, з канцылярыі ангельскае мовы — сакратар ангельскае мовы д-р Расьціслаў Гарошка. Старшыня Рэдакцыйнай Калегіі газэты „Беларус" і ейны Галоўны Рэдактар Д-р Станіслаў Станкевіч зрабіў справаздачу зь дзейнасьці Рэдакцыйнае Калегіі. Ён сьцьвердзіў, як асноўны факт, што газэта заваявала высокі аўтарытэт і прызнаньне сярод беларускага грамадзтва ўва ўсіх краёх расьсяленьня беларускае эміграцыі, даводам чаго выдатнае грамадзкае падтрыманьне ў галіне супрацоўніцтва, грашовай дапамогі ды ў акцыі пашырэньня газэты. У сувязі з гэтым ён запрапанаваў у форме адмысловай рэзалюцыі выказаць падзяку ўсім тым, што памагалі газэце. Прынятая аклямацыямі рэзалюцыя друкуецца на іншым месцы ў гэтым нумары газэты.

Справаздачы зь дзейнасьці аддзелаў БАЗА зрабілі: старшыня Аддзелу ў Кліўленьдзе Уладзімер Дунец, ад Аддзелу ў Дэтройце мгр. Васіль Пляскач, старшыня Аддзелу ў Нью Джэрзі Тамаш Супрун, старшыня Аддзелу ў Нью Ёрку мгр. Мікола Кунцэвіч. Справаздачу Рэвізійнае Камісіі прачытаў ейны старшыня Васіль Русак, запрапанаваўшы даць уступаючай Галоўнай Управе і Рэдакцыйнай Калегіі газэты „Беларус" абсалюторыюм з падзякай, што й было пастаноўлена аклямацыямі.

У дыскусіі над справаздачамі выступалі: В. Русак, А. Курыла, Я. Азарка, інж. М. Гарошка, Д-р Я. Станкевіч, Д-р Я. Сажыч, М. Тулейка, Ул. Дунец, Ул. Русак, М. Кунцэвіч, А. Міцкевіч, А. Стрэчань, З. Станкевіч, Ул. Курыла й некаторыя іншыя.

Із справаздачаў і дыскусіі зырка выявіліся як значныя дасягненьні арганізацыі, гэтак і ейныя недахопы. Усе выступаючыя кіраваліся шчырай руплівасьцяй працаваць так, каб у будучыні недахопы зьменшыліся, а дасягненьні пабольшыліся. Справаздачы й дыскусія пацьвердзілі, што найбольш працаздольнымі й актыўнымі, як і раней, былі Аддзелы БАЗА ў Нью Джэрзі й Кліўленьдзе ды што значна ажывіў сваю дзейнасьць Аддзел у Дэтройце. Была адзначаная недастатковая працаздольнасьць і актыўнасьць Аддзелу ў Нью Ёрку, што ў значнай ступені тлумачылася аб'ектыўнымі, ад арганізацыі незалежнымі прычынамі: вялікімі адлегласьцямі між паасобнымі сябрамі ў горадзе Нью Ёрку, адсутнасьцяй адпаведнага памешканьня для дзейнасьці арганізацыі ды поўнай або часткавай заангажаванасьцяй значнае колькасьці сяброў Аддзелу ў дзейнасьці Галоўнай Управы БАЗА, у аўтаномнай Рэдакцыі газэты „Беларус", у незалежным ад БАЗА Беларускім Інстытуце Навукі й Мастацтва, і інш.

Пасьля гэтага былі праведзеныя выбары новае Галоўнае Управы БАЗА. Із сямёх пададзеных кандыдатаў на старшыню Галоўнае Управы быў выбраны тайным галасаваньнем абсалютнай бальшынёй галасоў Д-р Расьціслаў Гарошка. За віцэ-старшыняў былі выбраныя: інж. Вячаслаў Станкевіч, Уладзімер Курыла і мгр. Васіль Пляскач, за сакратара ангельскае мовы — Д-р Ала Орса-Рамано й за сакратара беларускае мовы — Рая Станкевіч, за скарбніка — Браніслаў Даніловіч, за сяброў Галоўнае Управы — Юрка Мазура, Андрэй Стрэчань, Уладзімер Дунец, Міхась Тулейка, Аляксандар Міцкевіч.

За старшыню Рэдакцыйнае Калегіі газэты „Беларус" і ейнага Галоўнага Рэдактара выбраны аклямацыямі Д-р Станіслаў Станкевіч, за ягонага заступніка — Д-р Янка Запруднік ,за скарбніка Рэдакцыі — Барыс Данілюк, за сяброў Рэдакцыйнае Калегіі: Мікола Абрамчык, Праньціш Бартуль, Аляксандар Міцкевіч, Васіль Русак, Уладзімер Русак, Вячаслаў Станкевіч і Раіса Станкевіч. Усе выбраныя таксама аклямацыямі.

Дасюлешні склад Рэвізійнае Камісіі пастановай Кангрэсу, праведзенай аклямацыямі, быў перавыбраны й на наступную кадэнцыю. Рэвізійная Камісія складаецца з: Васіля Русака — старшыні і Ніны Стомы й Сяргея Гутырчыка — сяброў.

Кангрэс закончыўся агульным прапяяньнем беларускага нацыянальнага гімну.

Адмоўнай зьявай Кангрэсу быў вельмі сьціплы асабісты ўдзел у ім дэлегатаў з далейшых мясцовасьцяў — Кліўленду й Дэтройту. Неадпаведнай даводзіцца ўважаць дасюлешнюю практыку, калі дэлегат мае аж колькі перададзеных яму галасоў, а пажаданым і карысным, каб дэлегатаў, што ня могуць прыбыць на Кангрэс, заступалі іншыя сябры ня дэлегаты зь перададзенымі ім галасамі, ды каб прыймалі ўдзел у Кангрэсе іншыя сябры ня дэлегаты з дарадчым голасам. Кангрэсы БАЗА, як і Сустрэчы Беларусаў Паўночнае Амэрыкі, гэта дзьве адзіныя нагоды, калі шырэйшыя колы нашага грамадзтва могуць асабіста сустрэцца, абмяняцца думкамі ды абмеркаваць і ўзгодніць галоўныя лініі далейшае дзейнасьці. Дык гэтыя дзьве нагоды трэба й выкарыстоўваць у максімальнай ступені. Таксама застаецца адно вітаць выказаную на Кангрэсе А. Стрэчаням і Ул. Дунцом прапанову, каб наступны 15-ы Кангрэс БАЗА адбыўся ў Кліўленьдзе, што дало-б магчымасьць прыняць у ім удзел большай колькасьці Беларусаў Кліўленду й суседняга Дэтройту.

Прыемным і карысным быў па афіцыйным заканчэньні Кангрэсу сяброўскі вечар, падчас якога танцавальная група моладзі зь Нью Брансьвіку й Нью Ёрку ў калярытных народных вопратках пратанцавала два народныя танцы — Лявоніху й Мікігу, а найбольш галасістымі прысутнымі пяяліся беларускія песьні.

Ня ў прыклад папярэднім Кангрэсам БАЗА, што адбываліся ў Нью Ёрку, удзельнікі Кангрэсу й госьці гэтым разам ня былі змушанымі падмацоўвацца сухімі сэндвічамі або шукаць у суседзтве рэстаранаў ,бо на месцы маглі атрымаць па нізкіх цэнах добры гарачы абед і вячэру, за што належыцца заслужаная падзяка нашым жанчынам.

Ст. Ст.

МЭМАРАНДУМ ПРЭЗЫДЭНТУ ЗША

14-ы Кангрэс БАЗА пастанавіў зьвярнуцца з прывітальным лістом-мэмарандумам да Прэзыдэнта ЗША Рычарда Ніксана, поўны тэкст якога друкуецца ніжй:

June 4, 1971

The President of the United States
The White House
Washington, D. C. 20025

Dear Sir:

On behalf of the delegates of the biennial Congress of the Byelorussian American Association held in the New York City on May 30, 1971, it is my pleasure and privilege to convey to you, Mr. President, their expressions of firm support and backing of your domestic and foreign policies. The Byelorussian American Assaciation and its members want to see America strong and will do their utmost to help her prosper and to remain the greatest bastion of freedom in the world.

We are at the same time very much concerned about the lack of freedom, the disregard of the basic human rights and the disrespect for the national dignity of the Byelorussian people subjugated by Russian Communism. For years the Byelorussian people have been resisting the onslaught of Godless Communism and Russification. In this struggle they look toward the United States for moral support and encouragement.

We ask you therefore, Mr. President, to help implement the May 23, 1971 resolution adopted at the first meeting of the National Republican Heritage Groups (Nationalities) Council, calling for the inclusion of the Byelorussian language in the Voice of America broadcasts. There is ample evidence that the Byelorussian language service of the Voice of America will not only fortify the spirit of resistance among the Byelorussian people against the political and ideological enslavement by Communism, but will also secure for the United States much gratitude and friendship.

Sincerely,

Dr. Roger Horoshko
National Chairman

Прывітальныя лісты-мэмарандумы падобнага зьместу былі высланыя Віцэ-Прэзыдэнту ЗША Сьпіро Агню і Губарнатару Ньюёркаўскага штату Нэльсану Рокфэлеру.

З НАВУКОВАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ БІНІМ

Паседжаньне Навуковай Канфэрэнцыі Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва ў Кінгстане (Канада) 17-18 красавіка сёлета, пра якую інфармавалася шырэй у папярэднім нумары нашае газэты.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

ПАДВОЙНЫ ЮБІЛЕЙ ПРАЛАТА ПЯТРА ТАТАРЫНОВІЧА



Вялікаму беларускаму патрыёту й нацыянальнаму ды рэлігійна-каталіцкаму дзеячу Пралату Д-ру Пятру Татарыновічу 15 чырвеня сёлета спаўняецца 75 год ад ягонага нараджэньня ў 1896 годзе й 50 год ягонага сьвятарства. Хаця быў ён высьвечаны на сьвятара 12 чырвеня 1921 году, але пачаткі свае сьвятарскае дзейнасьці Юбіляр зьвязвае з датай 29 чырвеня гэнага-ж 1921 году, калі ён у дзень свайго патрона Сьв. Пятра адпраўіў урачыстую Прыміцыю (першую імшу).

Адзначаючы пяць год таму 70-ыя ўгодкі Пралата Пятра Татарыновіча ў 1966 годзе ў „Беларусе", аўтар гэтых радкоў пісаў: „Калі-б схарактарызаваць адным словам Пралата Пятра Татарыновіча, як беларускага дзеяча, дык найбольш адпаведна назваць яго чалавекам ідэі". Як чалавека й нацыянальнага змагара, што цалком прысьвяціў сваё жыцьцё Беларусі, аўтар згаданага юбілейнага артыкулу ў 1966 годзе паставіў яго побач з такімі вялікімі Беларусамі ў сьвятарскай сутане, як біскуп Фабіян Абрантовіч, ксёндз Адам Станкевіч і ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі, што ў змаганьні за ідэю сталіся беларускімі мучанікамі. Усё тое, што было тады мною сказана, даводзіцца паўтарыць і сяньня, бо больш дакладнага й адпаведнага выразу для характарыстыкі Юбіляра, як чалавек ідэі, знайсьці нельга, і больш дастойнага прыраўнаньня яго якраз да названых нацыянальных мучанікаў быць ня можа.

Узапраўды, глыбокі й бязьмежны патрыятызм ды сьвятая для яго нацыянальная ідэя верна спадарожнічалі Юбіляру на працягу ўсяго ягонага жыцьця ды былі неадлучнай арганічнай часткай і ягонае сьвятарскае дзейнасьці. Сьвятарства й беларускасьць у жыцьці й дзейнасьці Пралата Татарыновіча ніколі ня супярэчылі адно аднаму, наадварот заўсёды ўзаемна сябе дапаўнялі й тварылі адну сугучную ўва ўсіх сваіх зьявах арганічную цэласьць.

Другой асноўнай і ня менш важнай рысай Юбіляра тое, што ягоны патрыятызм і служба нацыянальнай ідэі заўсёды былі актыўнымі, ня толькі на словах, але і ў чынах. Належыць ён да тых ня многіх беларускіх працаўнікоў, што пры ніякіх абставінах, навет пры найгоршых, не сядзелі злажыўшы рукі ў чаканьні спрыяльнага для актыўнай дзейнасьці мамэнту, а заўсёды былі ў руху, у дзеі, бо гэтага вымагала іхнае нацыянальнае сумленьне.

Узапраўды шырокую нацыянальную дзейнасьць змог разгарнуць Пётр Татарыновіч пасьля мінулае вайны на эміграцыі. Асеўшы хутка пасьля ейнага заканчэньня ў Рыме, ён зь беларускай сялянскай упорыстасьцяй сыстэматычна выконвае пачэсную нацыянальную місію неафіцыйнага амбасадара Беларусі ў Вечным Горадзе пры найвышэйшым каталіцкім цэнтры — Ватыкане.

Вось найважнейшыя канкрэтныя дасягненьні ў дзейнасьці Юбіляра за паваенны пэрыяд. Дзякуючы ягоным стараньням, ужо ў 1949 годзе былі ўведзеныя сталыя беларускія перадачы ў Ватыканскім Радыё, кіраўніком якіх і галоўным аўтарам ад самага пачатку й да 15 студзеня сёлета быў Пралат Пётр Татарыновіч (ад 15 студзеня сёлета гэтыя функцыі пераняў а. Леў Гарошка). Ад 1950 году ён выдае ў Рыме беларускім лацінскім шрыфтам рэлігійна-грамадзкі месячны часапіс „Зьніч", укладаючы ў яго шмат энэргіі й працы, як аўтар, рэдактар, выдавец і тэхнічны працаўнік. Колькі год таму Рэдактар плянаваў дацягнуць да 100-га нумару часапісу й з прычыны непасільных цяжкасьцяў спыніць далейшае ягонае выдаваньне. На шчасьце, свайго пляну Рэдактар ня выканаў: перад намі ўжо 107 нумар „Зьніча" за студзень-сакавік сёлета. Трэба верыць, што гэтае карыснае выданьне Юбіляр будзе працягваць і далей.

Пасьля таго, калі апошні Ватыканскі Сабор надаў літургічныя правы, побач з лацінскай, і нацыянальным мовам, у тым ліку й беларускай, Пралат Татарыновіч апрацаваў беларускі тэкст рыма-каталіцкай багаслужбы. Ён пераклаў на беларускую мову й выдаў асобнай кніжкай сусьветнае славы раман Гэнрыка Сенькевіча „Quo Vadis", а так-жа Евангельле. Бяручы ўвагу на ягоныя вялікія заслугі ў беларускім каталіцкім руху, Апостальскі Пасад 26 травеня 1961 году надаў яму высокую сьвятарскую годнасьць Пралата Ягонае Сьвятасьці, як сьвятару Менскае дыяцэзіі каталіцкага абраду. Далей Апостальскі Пасад Актам Кансыстарыяльнае Кангрэгацыі 21 студзеня 1964 году назначыў Пралата Татарыновіча, тады ўжо сябру Найвышэйшае Рады для эміграцыі пры тэй-жа Кангрэгацыі, Дырэктарам Місіянэраў для эмігрантаў Беларусаў лацінскага абраду. На гэтым становішчы ён шмат спрычыніўся да таго, што адмысловым актам Ватыканскіх уладаў беларуская мова афіцыйна вызнаная годнай для карыстаньня ў багаслужбах лацінскага абраду.



Кс. П. Татарыновіч у дзень сваёй Прыміцыі (першае імшы) 29 чырвеня 1921 г.

Плённая й шырака разгалінаваная рэлігійная й нацыянальная дзейнасьць Пралата Татарыновіча ня перашкодзіла яму працаваць і над самым сабой. Вынікам гэтага было здабыцьцё ім высокай навуковай ступені доктара яшчэ ў 1949 годзе.

Пралат Пётр Татарыновіч увесь час наважаны й пасьлядоўны прыхільнік і абаронь нік беларускага каталіцтва ў ягоным лацінскім або заходнім абрадзе. І ўзапраўды, нельга ня прызнасьць правільнасьці ягонае пазыцыі. Беларускае абрадна-лацінскае каталіцтва гарантуе нас ад маскоўскіх рэлігійных прэтэнсіяў на Беларусь якраз таму, што яно **лацінскае,** як таксама забясьпечвае нас ад пасяганьняў з польскага боку іменна таму, што яно **беларускае.**

Сьціпла адзначаючы сяньня вялікі падвойны юбілей Пралата Д-ра Пятра Татарыновіча, ад шчырага сэрца хочацца пажадаць Яму добрага здароўя, нявычэрпнай энэргіі й даўгога жыцьця ды далейшых нацыянальных дасягненьняў для роднай Беларусі!

Ст. Станкевіч

БЕЛАРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ ПРОЗА 1970 ГОДУ

Юбілейная атмасфэра леташняга году і ўзмоцнены партыйны ціск на літаратуру адмоўна адбіліся на разьвіцці беларускае мастацкае прозы, і гэта, падобна як і ў паэзіі, у колькасных, гэтак і якасных дачыненьнях. Калі ў 68-ым годзе былі надрукаваныя чатыры новыя раманы, у 69-ым годзе — тры, дык летась зьявіліся ў літаратурных часапісах усяго толькі два раманы. У 68-ым г. было надрукавана дваццаць аповесьцяў, а летась і пазалетасьць па прынаццаць. У 68-ым годзе было надрукавана каля ста дваццаці апавяданьняў, у 69-ым г. — каля сотні, а летась усяго трохі больш за шэсьцьдзесят.

У сувязі з дырэктыўным накіроўваньнем літаратуры на актуальныя надзённыя тэмы й праблемы сучаснасьці ,у літаратурных часапісах значна больш, чымся ранейшымі гадамі, адводзілася месца літаратурна-публіцыстычным, пераважна нізкапробным з мастацкага боку, творам — нарысам або й творам чыста публіцыстычным за кошт твораў мастацкае літаратуры. Як вынік узмоцненага арыентаваньня на адлюстроўваньне герэікі партызанскага змаганьня ў мінулай вайне, летась прыкметна больш, чымся раней, друкавалася мэмуарнай літаратуры сьветкаў і ўдзельнікаў партызанскага руху.

З нагоды ленінскага юбілею ў творах мастацкае літаратуры настырліва прапагавалася, падобна як і ў паэзіі, ленінская тэма. Але ўзноў-жа, падобна як і ў паэзіі, беларуская ленініяна ў галіне мастацкае прозы ня мела значных мастацкіх дасягненьняў. Зьявілася летась значная колькасьць твораў г. зв. беларускае ленініяны, але ніводзін зь іх, улучна з апавяданьнямі й аповесьцямі пра Леніна гэткага таленавітага пісьменьніка, як Іван Шамякін, што апошнім часам цалком пераставіўся на ленінскую й гістарычна-рэвалюцыйную тэматыку, ня стаўся мастацкім дасягненьнем году.

Крытык Сэрафім Андраюк у сваім артыкуле ў газэце „Літаратура і Мастацтва" за 12 лютага сёлета сьцьвердзіў, што ў творах беларускае ленініяны, кажучы ягонымі словамі, „шмат ілюстрацыйнасьці, апісальнасьці, штучнай прыўзьнятасьці, дэклярацыйнасьці". І гэта цалком зразумела. Усюды там, дзе пісьменьніку згары накідаецца ня толькі тэма, але й даецца гатовае ейнае ідэйнае асэнсаваньне, і гэта ня толькі ў вагульным ідэйным асэнсаваньні тэмы, але і ў найдрабнейшых ейных дэталях, нельга чакаць жыцьцёва праўдзівага, псыхалягічна паглыбленага й непаўторнага арыгінальнага твору.

Дырэктыўнае накіроўваньне твораў мастацкае літаратуры на адлюстроўваньне сучаснасьці ў сфэры гарадзкога работніцкага жыцьця й праблемы вытворчасьці знайшло сваё найзырчэйшае ўжыцьцяўленьне ў ваповесьці Алеся Савіцкага „Сталявары". Але ўзноў-жа, з прычыны зададзенасьці тэмы й гатовае схэмы паказу людзей хвабрычнае працы аповесьць „Сталявары" ня сталася мастацкім дасягненьнем году. Галоўны пэрсанаж аповесьці Барашкін, спачатку некваліфікаваны рабочнік пры будове аўтамабільнага заводу, тады гэткі-ж просты сталявар адзначыўся гэткімі вялікімі вытворчымі дасягненьнямі й сваёй палітычнай дзейнасьцяй, што ў канцы дзеі аповесьці ляціць на 50-ыя ўгодкі БССР у Маскву ў складзе ўрадавае дэлегацыі БССР. Аповесьць „Сталявары" — асабліва зыркі прыклад агульнае зьявы, што ня можа спад пяра пісьменьніка, навет і таленавітага, выйсьці добры мастацкі твор, калі над мастацкімі крытэрыямі бяруць перавагу ідэйна-палітычныя патрэбы дня.

Не зважаючы, аднак, на цяжкую палітычную атмасфэру, беларуская мастацкая проза леташняга году, побач із стратамі й няўдачамі, мела й свае бясспрэчныя здабыткі, у кажным выпадку прыкметна больш, чымся ў 69-ым і 68-ым годзе. Гэта ў тых нямногіх выпадках, калі некаторыя пісьменьнікі, не зважаючы на агульную тэндэнцыю, патрапілі засярэдзіцца на тэмах і праблемах, у дачыненьні да якіх партыйнае рэглямантаваньне ня было гэтак строгае й дакладнае. З гэтага выразна скарысталі першнаперш абодвы леташнія раманы — „Мсьціжы" Івана Пташнікава і „Плач перапёлкі" Івана Чыгрынава.

На фоне шырокага паказу жыцьця беларускае вёскі палавіны 50-ых гадоў ды сярод вялікае колькасьці глыбака зындывідуалізаваных ейных жыхароў удалося Івану Пташнікаву ў рамане „Мсьціжы" стварыць тып карэннага жыхара вёскі Андрэя Вялічкі, у якім абагуленае й псыхалягічна абгрунтаванае ўсё лепшае й вышэйшае, чым жыла тагачасная беларуская вёска. Гэта тып мужнага й непахісна вытрывалага селяніна, якога ня ў сілах зламаць ніякія жыцьцёвыя выпрабаваньні, бо свае маральную моц чэрпае ён зь вечна жыватворнай крыніцы — роднай зямлі.

Мастацкае дасягненьне гаману

(Заканчэньне на 4 бачыне)

ХАТЫНЬ І КАТЫНЬ

Ангельская мова ня мае гуку „х", які ў перакладзе зь іншых моваў абазначаецца ў ёй праз літары „кей" і „эйч", або праз лацінскія „ка" і „аш". Таму Беларус, які занядбае на разьбежнасьць паміж чужым правапісам і сваёй фанэтыкай, вельмі зьдзівіцца дазнаўшыся з камунікату Задзіночаных Нацыяў з 22-га леташняга чырвеня, што: „А гадзіне другой папаўдні Генэральны Сакратар У-Тан у суправаджэньні містара Гурыновіча ўсклаў вянок перад помнікам у Катыні, пастаўленым у памяць Беларусаў, замардаваных гітлераўцамі". Адпавядае праўдзе, што беларуская вёска Хатынь, дзе У-Тан запраўды быў, сяньня ня менш вядомая чалавецтву, чымся зьнішчаны фашыстымі французкі гарадок Арадур або чэхаславацкая вёска Лідзіцэ, але чулі людзі таксама й пра Катынь, якую ён, а тым балей міністар замежных справаў БССР Гурыновіч, усё-ж ніколі не адважацца наведаць. Таму дазвольце цяпер прыгадаць ня толькі пра Хатынь, але й пра Катынь ды асабліва таму, што ейныя шматлікія ахвяры дагэтуль аніякімі помнікамі не ўшанаваныя.

Страшэнны лёс спасьцігнуў 22-га сакавіка 1943 году лясную вёску Хатынь на Лагойшчыне. Там, дзе цяпер узвышаецца пабудаваны з чорнага лабрадарыту двухскатавы дах сьвірану, знаходзіўся той самы сьвіран з саламянай страхой, у якім эсэсманы батальёну „Чорная сьмерць", паводля загаду штурмбанфюрэра Аскара Дзірлевангера, спалілі 152 тутэйшых жыхароў, а паміж імі 76 дзяцей. На месцы кажнае з 26 спаленых карнікамі хатаў устаноўлены з шэра-попельнага бэтону абгарэлыя ніжнія вянкі зрубаў, а над імі ўзьняліся адноўленыя коміны-стэлы, на версе якіх прымацаваныя званы, а ўнізе дошкі зь імёнамі людзей, што тут жылі. Цудам уратаваўся тады, згубіўшы сваю сям'ю ды сам паранены й абгарэлы, толькі каваль Язэп Камінскі, які стаўся правобразам для ўстаноўленае на нявысокім пл'ньце вялікае бронзавае скульптуры: змучаны, ледзь жывы стары нясе на руках мёртвага хлапчука да месца пахаваньня, дзе цяпер на помніку схіліла ў смутку галаву маці.

Велічны мэмарыяльны комплекс, які будавалі архітэктары Юры Градаў, Валентын Занковіч, Леанід Левін і скульптар Сяргей Селіханаў, узрушае кажнага, хто яго наведае. Тут на так званых „Могілках вёскаў" перахоўваюцца 136 урнаў зь зямлёй тых вёсак, якія, накшталт Хатыні, назаўсёды зьніклі з твару зямлі. А над агульнай магілай, на стэлі зь белага мармуру, высечаны прачулы напіс: „Людзі добрыя, помніце, мы любілі жыцьцё і Радзіму і вас дарагія. Мы згарэлі жывымі ў агні". І трэба аддаць вінавацце дыпляматычнасьці стваральнікаў комплексу, што ні ў гэтым надпісе, як і нідзе тут наагул, ні адным словам ня прыгадваецца аб партызанах, бо ня толькі кат Дзірлевангер, але й яны таксама спрычыніліся да пагібелі Хатыні. А ў пацьверджаньне гэтага дазвольце із шматлікіх падобных прыкладаў прывесьці адзін, узяўшы характэрную вытрымку з савецкага друку.

У № 52-м газеты „Літаратура і Мастацтва" за 1965 год, у артыкуле „Што засталіся паза сьпісам", аўтар, паміж рознага іншага, піша: „Летась мне давялося разам з былым партызанам Героем Савецкага Саюзу Ўладзімерам Парахневічам, зрабіць паездку па Бабруйшчыне. У вадным месцы, на беразе рачулкі Ола, Уладзімер Аляксеявіч прыгадаў, як ён тут зь сябрамі зьнішчылі групу фашыстаў з суседняга гарнізону. Мясцовы хлапчук год чатырнаццаці круціўся побач, прыслухоўваўся да нашай размовы, а потым пераканана, амаль са злосьцю сказаў: „Ге-рой! А пра нас і не падумалі, што Немцы праз вас маглі нашу вёску разам з намі спаліць!" І ці не гаротнага аднагодка гэтага абуранага хлапца нясе стары на помніку ў Хатыні?

Паблізу ад Смаленску знаходзіцца старадаўная беларуская вёска Катынь. Хоць ейная назва паходзіць ад рэчкі Катынаўкі, якая тут уцякае ў Дняпро, і хоць нічым ня спрычынілася яна да тае жудаснае падзеі, што тут здарылася, але пасьля яе тая назва набыла яшчэ іншае значаньне — каты. Ідучы сьледам расейскіх цароў ды прускіх каралёў, Гітлер і Сталін у 1939 годзе падзялілі паміж сабой Польшчу, паклаўшы гэтым пачатак Другой сусьветнай вайне. З агульнага ліку палонных, 15 тысяч ахвіцэраў апынуліся ў лягерах Казельск, Старабельск і Асташкаў. Па кароткім часе энкаведыстыя пачалі вывозіць іх у незядомых напрамках, але й тады на Захадзе сталася вядомым, што вязьняў з Казельску адвозілі да Смаленску. І ўсё-ж калі ў сакавіку 1943 году радыё Бэрлін паведаміла аб знаходцы Немцамі ў Катыні магілаў польскіх ахвіцэраў, замардаваных саветамі, спачатку шмат хто ня даў таму веры, пазнаёміўшыся ўжо ізь зьверствамі самых гітлераўцаў. Аднак паступова выявілася, што тут яны мелі слушнасьць.

На шырокай лясной паляне было адкапана з 8-мі вялікіх магілаў 4 тысячы 383 трупы ў рэштках формы ахвіцэраў польскае арміі, што адпавядала ліку палонных, вывезеных з Казельску. Мне давялося наведаць тады Катынь і таму, як сьветка, цалком далучаюся да высноваў прафэсараў судовае мэдыцыны, запрошаных у першую чаргу з Варшавы, што значная ступень раскладаньня мерцьвякоў даводзіла забойства іх яшчэ за савецкія часы. Тое-ж пацьвярджалі й даты на знойдзеных дакумантах, а таксама ўспаміны вакольных жыхароў пра начную страляніну ўвесну 1940 году. І асабліва ўзрушыў мяне знойдзены тут сьціплы нацельны абразок, магчыма матчына багаслаўленьне, на якім быў паэтычны напіс: „Сьвятая Тэрэза і дзіцятка Ісус — дождж ружаў". Пабачыўшы яго, згадаліся мне тады раптам радкі з „Эпічных фрагментаў" Аляксея Зарыцкага:

Ой, па сыну плакала
Маці каля Кракава,
Плача ля Ўладавы:
Сыне Ўладыславе . . .

Калі 18-га сакавіка 1942 году генэрал Андэрс, фармуючы з палонных Другі польскі корпус, запытаўся ў Сталіна пра вязьняў з Казельску, дык пачуў ад таго, што тыя ўцяклі й нямаведама дзе цяпер знаходзяцца. Затое міністар нутраных справаў Бэрыя, хоць і ня зусім зразумела, але больш шчыра заўважыў: „Мы зрабілі вялікую памылку, вялікую памылку. . ." Тым ня менш на Нюрэнбергскім працэсе СССР паспрабаваў ускласьці на Немцаў адказнасьць ня толькі за Хатынь, але й за Катынь, аднак заходнія саюзьнікі гэты намер адкінулі. Затое, на жаль, калі ў 1952 годзе адмысловая камісія Кангрэсу США, апытаўшы 380 сьветкаў, прыйшла да высноваў, што за мардэрства ў Катыні адказны толькі СССР, дык тагачасны прэзыдэнт не дазволіў прадстаўніку ЗША ў ЗН парушыць гэтага пытаньня.

Характэрна, што добра азнаёмлены з таямніцамі Крэмля Мілаван Джыляс у вядомай кніжцы „Новая кляса" абвінавачвае ў Катыні вылучна Саветаў. Ня менш аўтарытэтная ў гэтай галіне й Сьвятлана Алілуева, якая ў сваіх успамінах „Толькі адзін год", прыгадаўшы, што Сталін у Бальшым тэатры не глядзеў ніколі опэры „Іван Сусанін" да канца, піша далей: „А што яму было да гэтай пагібелі нейкіх Палякоў у лесе? Магчыма яна прыгадвала яму патаемнае зьнішчэньне ў лясох Катыні палонных польскіх ахвіцэраў савецкім урадам у 1940-м годзе?"

Спадзяюся, вы пераканаліся ў тым, што ня толькі Хатынь, але й Катынь зьяўляецца помнікам Другое сусьветнае вайны, і ейныя брацкія магілы заслугоўваюць належнага ўшанаваньня. Ня гледзячы на спробы перакруціць трагэдыю Катыні, праўда пра яе ведамая сяньня ўсяму сьвету, а найбольш балюча вычуває прыпамін аб ёй польскі народ. Не дарма ў часе Пазнанскага паўстаньня 1956 году, якому сьветкам стаўся тагачасны Генэральны Сакратар Задзіночаных Нацыяў рыцар паводля свайго духовага складу Даг Гамэршылд, увесь вялікі свабапалюбны горад скандаваў з болем рытмічна й голасна:

„Ка-тынь! Ка-тынь! Ка-тынь!".

Юрка Віцьбіч

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

ЗЬ БЕЛАРУСКАГА САВЕЦКАГА ДРУКУ

ЗАНЯДБОЎВАЕЦЦА НАЦЫЯНАЛЬНАЯ СПАДЧЫНА

„. . . Вычучэньне багатай спадчыны такіх яе волатаў, як Купала і Колас, адкрывае шырэй вочы на сучаснасьць. Толькі шкада, што гэтае вывучэньне не наладжана ў нашай рэспубліцы, як сыстэма. Пры ўсіх посьпехах купала- і коласазнаўства мы пакульшто ня маем дасьледваньняў асобных найбольш значных пэрыядаў жыцьця песьняроў, іх грамдзкай і навуковай дзейнасьці, не дасьледаваны пераклады Купалы і Коласа на мовы іншых народаў, ня створаны пакуль іх навуковыя біяграфіі, мы ня маем навет летапісу іх жыцьцяў, цалкам аддадзеных служэньню народу . . .”

„. . . У будучым годзе спаўняецца 90 гадоў з дня нараджэньня Купалы і Коласа. Гэта — ня музэйныя даты. Яны павінны стаць вялікім нацыянальным сьвятам усяго беларускага народу, да яго трэба прывабіць увагу і іншых народаў нашай Радзімы (г. зн. Савецкага Саюзу — Рэд.). Было-б добра, каб да дзён урачыстасьцяў на плошчах Менску паўсталі велічныя помнікі бацьком нашай літаратуры Купалу і Коласу.

У нашай краіне (г. зн. у Савецкім Саюзе — Рэд.) сталі новай прыкметай часу масавыя сьвяты паэзіі: яны праходзяць у Міхайлаўскім, на радзіме Пушкіна, у Каневе ля магілы Шаўчэнкі, у Канстантынаве на радзіме Ясеніна. Хай-жа сярод іх будуць і сьвяты паэзіі Купалы і Коласа”.

(З прамовы Уладзімера Юрэвіча на 6-ым зьезьдзе пісьменьнікаў Беларусі. „ЛіМ”, 7 травеня 1971).

БЕЛАРУСЬ І ТУТ НА ШЭРЫМ КАНЦЫ — ДЗЯКУЮЧЫ ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫЦЫ ПАРТЫІ

„. . . Мы ў Беларусі да апошняга часу выдавалі 3-5-7 перакладных кніг у год, у той час як у Літве выходзіла больш сотні, у Азэрбайджане —амаль па 70 і г. д. Некаторыя таварышы ў нас разважаюць так: маўляў, Беларусы ня могуць раўняцца зь Літоўцамі ці Азэрбайджанцамі, спасылаючыся на так званы моўны бар'ер. Навошта, маўляў, перакладаць замежных клясыкаў на беларускую мову, калі яны перакладзены на рускую. Аргумэнт гэты ня вытрымлівае ніякай крытыкі, і толькі робіцца сумна, калі чуеш падобныя разважаньні.

Па-першае, перакладаць зь іншых моў нам патрэбна для таго, каб наша літаратура разьвівалася нармальна; бяз гэтага ня можа абысьціся ні адна літаратура ў сьвеце, калі яна хоча жыць доўгі век у добрым здароўі; бязь перакладаў любая літаратура будзе хірэць і заняпадаць, бо парушыцца натуральны крывяабмен у яе арганізьме, — гэта аксіёма, элемэнтарная ісьціна...

. . . . Зрэшты, неабавязкова браць прыклад з рэспублік, дзе існуе так званы моўны бар'ер. Возьмем Украіну, мова якой такая-ж блізкая да рускай, як і наша беларуская. Там перакладаюць і выдаюць у шмат разоў больш, чым у нас. Толькі спэцыяльныя тоўстыя часапісы „Всесвіт” і „Сузір'я” друкуюць толькі перакладную літаратуру

Пераклады друкаваць і выдаваць у нас вельмі цяжка. Пры гэтым звычайна спасылаюцца на недахоп паперы. Кожны з нас ведае, што сапраўды з паперай трудна. Але міжволі ўзьнікае пытаньне: а дзе-ж бяруць паперу Літоўцы, Азэрбайджанцы, Украінцы? Можа, у іх ня больш паперы, а проста яны больш разумна яе выкарыстоўваюць? Мо-мя”, № 2, люты 1971).

жа яны ня дублююць стотысячнымі тыражамі тыя выданьні, зь якімі выдатна спраўляюцца цэнтральныя, маскоўскія выдавецтвы? Калі ўрад выдзяляе нам паперу, ён, мабыць, ня ведае, што мы яе пусьцім на дубляваныя выданьні, ён думае, што для нацыянальных выданьняў гэтай паперы павінна хапіць (у запраўднасьці ня хто іншы, як гэны-ж урад прымушае дубляваць маскоўскія выданьні на расейскай мове па тое, каб нельга было выдаваць на мове беларускай — Рэд.). Творы нашых празаікаў на роднай мове выходзяць тыражом у 7-10 тысяч экзэмпляраў, а гэтыя-ж творы на рускай мове выходзяць тут-жа, у нас, тыражамі ў 100 тысяч экзэмпляраў. Ільвіная доля іх асядае тут, у Беларусі. Але чаму? Чым кіруюцца выдаўцы і кнігагандаль? Паводля апошняга перапісу насельніцтва, 80 працэнтаў Беларусаў сваёй роднай мовай лічаць беларускую. Дык давайце-ж з гэтых дзяржаўных лічбаў і выходзіць. Статыстыка для таго і дае нам дадзеныя, каб імі мы кіраваліся на практыцы”.

(З прамовы Ніла Гілевіча на 6-ым зьезьдзе пісьменьнікаў Беларусі. „ЛіМ”, 7 травеня 1971).

АРМІЯ ДАРМАЕДАЎ

„Толькі ў Віцебскай вобласьці, напрыклад, выхаваўчую работу, апрача 9.948 прапагандыстаў сеткі партыйнай і камсамольскай асьветы, вядуць 2,500 лектараў і дакладчыкаў партыйных камітэтаў, 1,624 агітатары, амаль 15 тысячаў лектараў таварыства „Веды”, больш за 8 тысячаў палітінфарматараў”.

(Павал Дзядзюля: Сельская інтэлігенцыя і культура вёскі. „Полымя”, № 2, люты 1971).

БЕЛАРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ ПРОЗА 1970 ГОДУ

(Заканчэньне з 3-яй бач.)

Івана Чыгрынава „Плач перапёлкі” галоўна ў тым, што пісьменьнік, таксама на фоне шырокага адлюстраваньня жыцьця беларускае вёскі, на прыкладах вялікае колькасьці ейных жыхароў патрапіў праўдзіва й пераконліва перадаць настроі й перажываньні беларускага сялянства адразу пасьля заняцьця Беларусі нямецкай арміяй у мінулай вайне. Не зважаючы на накіданую згары тэндэнцыю гераізацыі ў творах пра мінулую вайну, аўтару раману „Плач перапёлкі” ўдалося захаваць поўную сугучнасьць праўды жыцьця з мастацкаю праўдаю.

Спасярод згаданых трынаццаці аповесьцяў, што зьявіліся летась, высокім мастацкім узроўнем і аб'ектыўным адлюстраваньнем рэчаіснасьці вызначаюцца дзьве: „Сотнікаў” Васіля Быкава й „Зноў у Будневе” Анатоля Кудраўца. Узяўшы за тэму свае аповесьці эпізод з партызанскага руху на Беларусі ў мінулай вайне, Васіль Быкаў з уласьцівым яму веданьнем людзкае душы й здольнасьцяй глыбокага псыхалягічнага аналізу адлюстраваў нявымоўную трагэдыю ня толькі беларускага цывільнага жыхарства ў вабставінах партызанскага руху, але й самых партызанаў. У аповесьці „Зноў у Будневе” Анатоль Кудравец на фоне сучаснага жыцьця беларускае вёскі ўмела й пераконліва паказаў арганічную духовую сувязь зь вёскай гарадзкое інтэлігенцыі, што зь вёскі выйшла. Да лепшых аповесьцяў леташняга году можна залічыць яшчэ аповесьць Аўгена Радкевіча „Буяла лета” ды аповесьць Кляры Пішчыкавай „Мера шчасьця і болю”.

Адзначаючы прыкметны спад у разьвіцьці беларускага апавяданьня леташняга году, крытык Сэрафім Андраюк у згаданым сваім артыкуле за найвышэйшае дасягненьне ў вапавядальным жанры паставіў апавяданьне Янкі Брыля „Гуртавое”. Андраюк зусім трапна падчыркнуў, што „не спрашчаючы складанасьцяў жыцьця, бачучы й адчуваючы цяжкасьці яго, пісьменьнік у вапавяданьні „Гуртавое”, паказваючы звычайны штодзённы побыт і працу, адкрывае крыніцу такой чыстай, паэтычнай радасьці, якая захопліваe нас цалкам, узвышае і ачышчае”. Калі ўжо канкрэтна называць найлепшыя апавяданьні году, дык ніяк нельга абмінуць і другога выдатнага апавяданьня — Уладзімера Караткевіча „Вока тайфуна”, пра якое Андраюк, спыняючыся й над апавяданьнямі зусім нізкапробнымі, нат ня ўспомніў. А тымчасам Караткевічава апавяданьне „Вока тайфуна” з кажнага гледзішча — і войстрай інтрыгай сюжэту, і ўдалай кампазыцыяй, і рэдкай у жыцьці высакароднасьцяй галоўнага героя Сьцяпана Дубаўца, што, наражаючы сваё жыцьцё, ратуе ад няўхільнай сьмерці свайго суперніка ў каханьні Анатоля Каню, можа быць, на нашую думку, пастаўленае за ўзор паўнавартаснага зь літаратурна-мастацкага боку апавяданьня.

Да лепшых апавяданьняў леташняга году зь некаторымі засьцярогамі можна залічыць наступныя апавяданьні маладых аўтараў: „Салавей” Міхася Вышынскага, „Атава” Леаніда Гаўрылкіна, „Жыві” Міколы Капыловіка, „Па тальм сьнезе” Віктара Карамазава, „Бацькі і дзеці” і „Песьня апоўначы” Аркадзя Марціновіча, „Казка пра Белага Арапа” Аўгена Радкевіча. Аднак раўнуючы да лепшых ранейшых апавяданьняў пералічаных пісьменьнікаў, іхныя апавяданьні леташняга году ўсё-ж не становяць кроку наперад у творчым разьвіцьці згаданых пісьменьнікаў.

Падагульняючы наш агляд беларускае мастацкае прозы леташняга году, нельга ня пыйсьці да наступнае высновы. Спасярод твораў, пісаных строга паводля сацыяльнага заказу, на тэмы й праблемы надзённае партыйнае палітыкі, ня было больш-менш значных мастацкіх дасягненьняў. І наадварот, творчыя ўдачы, навет і выдатныя, спатыкалі пісьменьнікаў у творах, у якіх, адгароджваючыся ад надзённае палітыкі, засяроджваліся яны на тэмах і праблемах непасрэднае жыцьцёвае важнасьці: агульналюдзкіх, нацыянальных і прыватна-асабістых.

Раман Шарупіч

СПРАВЫ МОЛАДЗІ

У НЬЮЁРКАЎСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ МОЛАДЗІ

14 травеня сёлета адбыўся агульны перавыбарны сход Аддзелу Арганізацыі Беларуска--Амэрыканскае Моладзі ў Нью Ёрку. У новую Управу Аддзелу ўвайшлі: Рая Станкевіч — старшыня,, Аня Бартуль — заступнік старшыні, Ніна Запруднік — сакратар, Галіна Тумаш — скарбнік, Язэп Казьлякоўскі — сябра Управы.

Пасьля выбараў быў абмеркаваны плян працы. Управа пастанавіла добра папрацаваць, каб зрабіць Аддзел Моладзі ў Нью Ёрку актыўным. А дзеля гэтага трэба першнаперш старацца павялічыць колькасьць сяброў Аддзелу. З гэтаю мэтаю Управа пастанавіла прабаваць навязаць лучнасьць з тымі сябрамі Арганізацыі Моладзі, якія з розных прычынаў пакінулі яе. Заданьнем Ньюёркаўскага Аддзелу — ахапіць усю мясцовую беларускую моладзь у вадну працаздольную й сьвядомую свае нацыянальнае спадчыны групу.

Каб умацаваць зацікаўленьне беларускім народным танцам, мы адразу-ж прыступаем да арганізацыі дзявоцкага танцавальнага гуртка.

Мы зьвяртаемся гэтай дарогай да старэйшага беларускага грамадзтва, у першую чаргу да бацькоў з просьбаю даць нам патрэбную дапамогу ў зарганізаваньні танцавальнага гуртка, уплынуць на моладзь, каб яна прыймала ў ім удзел, прывозіць удзельнікаў гуртка на пробы й дапамагчы прыдбаць вышываную народную вопратку.

Наш плян працы на будучыню разнастайны й цікавы. Мы будзем пра яго інфармаваць у меру ягонае рэалізацыі. Мы верым, што ў нашай працы мы знойдзем падтрымку й сяброўскую дапамогу з боку добра зарганізаванага суседняга Аддзелу Арганізацыі Беларуска-Амэрыканскае Моладзі ў Нью Джэрзі. Мы ведаем, што спачатку будзем мець цяжкасьці сцэмэнтаваць пасьля даўжэйшага заняпаду й разьвіваць наш Аддзел Моладзі ў Нью Ёрку.

Мы маем добрую волю й надзею на лепшую будучыню, бо працаваць маем для высокае нацыянальнае мэты, каб жыла Беларусь.

Рая Станкевіч

САЮЗ БЕЛАРУСКАЕ МОЛАДЗІ Ў МЭЛЬБУРНЕ

30 травеня сёлета ў Доме Сп-ва Грушаў, у Норт Альтона, адбыўся арганізацыйны сход беларускае моладзі ў Мэльбурне (Аўстралія). Падзея гэтая, на якую чакалася даўно, адкрывае новую, ясьнейшую балонку жыцьця Беларусаў у Мэльбурне.

Патрэба арганізацыі беларускае моладзі адчувалася й ставілася даўно. Дый былі ўжо некаторыя спробы арганізацыйных завязкаў, якія, аднак, доўга ня трывалі. Таму старэйшыя зь вялікай прыемнасьцяй прывіталі заклік прадстаўнікоў моладзі — Ніны Грыцук і Алы Корбут — школьніц, дапамагчы ў арганізаваньні моладзі й на агульным сходзе — пасьля Сакавіковых сьвяткаваньняў — даручылі сп-ні Е. Яцкевіч падрыхтаваць і склікаць дзеля гэтае мэты сход моладзі, што яна й выканала.

Сход адчыніла сп-ня Е. Яцкевіч, выясьняючы патрэбу й мэты арганізацыі беларускае моладзі. Побач зь ёю за прэзыдыяльным сталом сядзелі ініцыятаркі гэтае справы — згаданыя Ніна Грыцук і Ала Корбут. У працэсе сходу паклікалі ў прэзыдыюм студэнтаў вышэйшых школаў Віктара Швэда й Юрку Нікана, якія, паразумеўшыся зь ініцыятаркамі, дабралі яшчэ з прысутных Міколу Гуза, Уршулю Нікан і Юрку Шнэка, і гэткім парадкам із 7-мі асобаў стварылі часовую Управу Саюзу Беларускае Моладзі ў Мэльбурне. У Саюз запісалася пакульшто 17 асобаў.

Пастаноўлена, што 3 чырвеня зьбярэцца часовая Управа СБМ на паседжаньне, падзеліцца абавязкамі ды апрацуе плян працы на бліжэйшую будучыню. Адначасна сябры Управы спрабуюць асабіста паразумецца із сваімі сябрамі Беларусамі, што ня былі на Сходзе, каб заахвоціць і іх увайсьці ў арганізацыю.

Сход афіцыйна зачыніў Віктар Швэд, дзякуючы прысутным за актыўны ўдзел у ім. А нам старэйшым застаецца толькі пажадаць Саюзу Беларускае Моладзі ў Мэльбурне памыснай працы дзеля карысьці й прыемнасьці асабістай, а таксама й перадусім дзеля карысьці беларускай. Шчасьці ім, Божа!

М. Н.

ВАЗЬМЕМ ПРЫКЛАД!

У нядзелю 16 травеня сёлета танцавальная група Аддзелаў Нью Брансьвік і Нью Ёрк Арганізацыі Беларуска-Амэрыканскае Моладзі выступіла з двумя народнымі танцамі на вечары ў Нью Ёрку, які быў ладжаны Радай Народных Фэстываляў Нью Ёрку (Folk Festival Council of New York, Inc.).

Наш Танцавальны Гурток вельмі прыгожа й добра выканаў два беларускія народныя танцы — Лявоніху й Мікіту. Шэсьць параў маладых сяброўак і сяброў згаданых аддзелаў арганізацыі моладзі ў прыгожых і калярытных нацыянальных вопратках выклікалі гучны апляўз у аўдыторыі. Таму прыемна тут назваць і танцорак ды танцораў. Гэта: Аксана Януш, Галіна Кажура, Ірэна Азарка, Аўген Лысюк, Віктар Лосік, Юрка Азарка, Аляксандар Харавец, Янка Лук'янчык і Мікалай Швэд — з Аддзелу Нью Брансьвік; Аня Бартуль, Галіна Тумаш і Ніна Запруднік — з Аддзелу Нью Ёрк.

Гэткае выступленьне было ня першы раз. Кажны год Танцавальны Гурток прымае ўдзел у выступленьнях нацыянальных групаў на народных фэстывалях Нью Ёрку.

Заснаваньне й кіраваньне Танцавальнага Гуртка — ня лёгкая праца. Гэтую працу праводзіць у Аддзеле моладзі ў Нью Джэрзі Аўген Лысюк. Ён ініцыятар і духовы кіраўнік гэтага гуртка. Пра беларускую дзейнасьць Аўгена Лысюка, як ён яе пачаў і чаму яе працягвае, я й хачу напісаць тут пару словаў, каб ведалі пра гэта іншыя й бралі прыклад.

Аўген Лысюк нарадзіўся ў вёсцы Навасёлкі ў Заходняй Беларусі. Вандроўнае дзяцінства выпала на ягоную долю: з далёкай Поўначы, дзе ён прымусова апыніўся быў з бацькамі, праз Расею, Пэрсію, Індыю, Афрыку й Ангельшчыну прывандравала сям'я Лысюкоў у Амэрыку, дзе й асела на стала. У 1953 годзе тут у Нью Ёрку Аўген уступіў у Аддзел Згуртаваньня Беларускае Моладзі й стаўся ягоным актыўным сябрам.

Пазьней, вярнуўшыся ўжо дарослым маладым чалавекам з амэрыканскага войска, ён паступіў у Беларускую сыботнюю школу, каб добра навучыцца беларускае мовы, дарма што сябры ў школе былі шмат маладзейшыя векам за яго. Як сябра Танцавальнага Гуртка моладзі, ён удзельнічаў у выступленьнях Гуртка на тэлевізыйнай праграме Polka Party, на інтэрнацыянальным Folk Art Festival у Вашынгтоне і таксама на беларускіх імпрэзах, нацыянальных угодках ды Сустрэчах Беларусаў Паўночнае Амэрыкі.

Перабраўшыся у Нью Брансьвік, ён заняўся моладзяй і стаўся для яе ня толькі кіраўніком народных танцаў, але й быў старшынём Аддзелу моладзі ў гадох 1961, 1964, 1967 і 1968. Дзякуючы ягонай працы, паўстаў сталы Танцавальны Гурток Аддзелу моладзі ў Нью Джэрзі. Пад ягоным кіраўніцтвам, а пазьней пры ягонай сталай і руплівай дапамозе Аддзел моладзі ў Нью Джэрзі стаўся адным з найактыўнейшых аддзелаў маладзёжнай арганізацыі ў Амэрыцы.

І хоць амаль усе сябры Аддзелу моладзі ў Нью Джэрзі нарадзіліся ўжо ў Амэрыцы, дзякуючы моцнаму нацыянальнаму беларускаму асяродзьдзю, іскра патрыятызму, пакладзеная бацькамі ў сэрцы сваім дзецям, не патухла, а гарыць і сяньня. У гэтым якраз кірунку працуе й Аўген Лысюк, бо аднойчы сам сабе ён сказаў, што гэта ягоны абавязак. Дык узяў на сябе гэты абавязак, нясе яго й ня кідае, бо так загадала ягонае нацыянальнае сумленьне.

На аднэй з пробаў Танцавальнага Гутрка перад выступленьнем на 16 травеня сёлета, мне асабіста найбольш спадабалася адна пара танцароў — Паўлінка й Рыгорка Лысюкі, зусім маленькія дзеці Аўгена. Яны, узяўшыся за рукі, прабавалі не аставацца ад танцораў. „Няхай прывыкаюць ад маленства”, — сказаў Аўген . . .

„Няхай прывыкаюць” —і будуць прывыкаць і іншыя малыя дзеці ў Нью Джэрзі да беларушчыны, пакуль будуць там жыць і працаваць такія Беларусы, як Аўген Лысюк.

Рая Станкевіч

Таіса Бондар

СПОВЕДЗЬ

Колькі бачыла
сонцам залітых лагчын,
гарадоў,
якім мора далоні лізала,
захапленьнем квітнелі вочы,
а сэрца маўчала:
дзесьці ціха кацілася Сьвіслач,
зьбіралі расу касачы,
і паілі блакітам
вясёлую раніцу сны,
пашпурляўшы ў возера зоркі
адна за адною,
і брылі па калена ў вадзе
ракіты гурмою,
і ў песьнях птушыных
купаліся ўранку лясы . . .
Ды і з чым параўнаеш
прастору Радзімы,
калі
кожнай кветцы тут,
кожнай сузьвінцы сястра я.
Дзе-б ні йшла,
памяць думкі дадому вяртае.
Прыкіпела я сэрцам
да роднай зямлі.

У ПАЛОНЕ ГОР

Насоўваўся вечар,
маўклівы і кейкі прамоклы.
З апошнім сьвятлом
дагараў суквецьцямі рададэндран.
Мне-ж мроіўся край мой,
затканы узорам рамонкаў,
і плямёны сонца
на шапках сасновых бароў.
А горы трымалі нас моцна
ў вабдымках каменных.
Куды ні кінь вокам —
няроўныя пікі хрыбтоў
упіраюцца ў неба,
зрываючы з воблакаў пену.
І сьцелецца пена
туману халодным пластом.
Ледзь чутна уздрыгвала часам
зямля пад нагамі,
далёка чуваць быў
кожны спалоханы гук.
І хоць мы былі тут
адзінымі ў сьвеце бакамі,
сьціскалася сэрца . . .
Нічым не адгоніш тугу.
Бо ўсё харастно,
ўсё багацьце і веліч Каўказу,
вякамі здабытыя
зь нетраў магутнай зямлі,
губляліся ў россыпе
матчыных песень і казак,
якія зь дзяцінства
глыбока у сэрцы жылі.

(„Маладосьць”, № 2, люты 1971).

Таіса Бондар — нарадзілася ў 1945 г. у Рудзенску на Меншчыне. У 1967 г. скончыла Менскі дзяржаўны пэдагагічны інстытут замежных моваў. Працуе выкладчыцай ангельскай мовы ў ваднэй із школаў гораду Фалюшты ў Малдавіі. Дэбютавала ў беларускай паэзіі адно летась, надрукаваўшы ў газэце „Літаратура і Мастацтва” за 27 студзеня 1970 г. пяць першых сваіх вершаў.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БЕЛАРУСКАЯ БІБЛІЯТЭКА Й МУЗЭЙ ФРАНЬЦІШКА СКАРЫНЫ У ЛЁНДАНЕ

Праф. Робэрт Оты адсланяе мармуровую табліцу пры ўваходзе ў Беларускую Бібліятэку й Музэй Франьцішка Скарыны ў Лёндане

Беларуская грамадзкасьць Вялікабрытаніі, згуртаваная вакол Дому Марыянаў, ЗБВБ і Англа-Беларускага Таварыства, 15 травеня ўрачыста адзначала гістарычную падзею адкрыцьця й высьвячэньня першай у такім маштабе за межамі Беларусі Беларускай Бібліятэкі й Музэю Франьцішка Скарыны ў Лёндане.

Імпазантны будынак ББіМФС знаходзіцца ў Фінчлей, прыгожым, багатым у зелень і кветкі, раёне Лёндану. Побач яго два падобнага стылю дамы Беларускае школы й інтэрнату Сьв. Кірылы Тураўскага, а насупраць праз вулі'цу Гоўльдэн Роўд — Дом Беларускіх Марыянаў. Управу ББіМФС ачольвае Біскуп Часлаў Сіповіч, бібліятэкар — а. Аляксандар Надсон, ён-жа й дырэктар школы Сьв. Кірылы Тураўскага.

Урачыстасьці, што трывалі два дні, былі ўкаранаваньнем блізу чверцьвяковай працы, дэтэрмінацыі й веры Біскупа Часлава Сіповіча, які яшчэ ў 1947 г., як малады сьвятар, пачаў працу над зарганізаваньнем бібліятэкі й музэю, прыцягнуў да яе ня толькі беларускія навуковыя сілы, але й здабыў прыхільнасьць і дапамогу чужых вучоных і эстэтаў, зь якіх у першую чаргу належыцца ўспомніць сакратара Англа-Беларускага Таварыства сп. Г. дэ Пікарду. Здабыў падтрымку беларускага грамадзтва ня толькі ў Вялікабрытаніі, але й ува ўсім сьвеце.

Біскуп Часлаў Сіповіч, Апостальскі Дэлегат у Вялікабрытаніі Арцыбіскуп Дамінік Энрычы, ізраэльскі Рабін Баўм, віцэ-бурмістр лёнданскай акругі Фіншлей і Барнэт сп. Фрыдман із жонкай разглядаюць архівальныя беларускія старадрукі ў Музэі

15 травеня, у сыботу а гадзіне 16:30, у паважнай узвышана-сьвяточнай атмасфэры ў прысутнасьці выдатнай шматнацыянальнай аўдыторыі Прафэсар параўнаўчай славянскай філялёгіі на ўнівэрсытэце Оксфарду Робэрт Оты зыканаў абрад адкрыцьця Бібліятэкі й Музэю адсланьнем мармарнае табліцы, што вісіць праваруч пры ўваходзе ў Бібліятэку, з напісам:

„Гэтая Беларуская Бібліятэка й Музэй названая ў гонар Франьцішка Скарыны з Полацку была адкрытая 15 травеня 1971 г. Прафэсарам Рабэртам Оты ў прысутнасьці Яго Дастойнасьці Арцыбіскупа Дамініка Энрычы Апостальскага Дэлегата ў Вялікабрытаніі".

Малітвай высьвячэньня быў прачытаны сьпярша паангельску, а пасьля Уладыкам Чаславам Сіповічам пастарабеларуску арыгінальны Скарынаў тэкст 126-га Псальму, узятага з Псалтыра, выдадзенага Франьцішкам Скарынам у Празе Чэскай 1517 г. Яго Дастойнасьць Арцыбіскуп Дамінік Энрычы пасьвяціў 12 заляў двухпавярховага будынку ББіМФС.

У прасторнай, сьветлай, прыемна ўладжанай чытальні, на фоне паўколам выгнутых у сад вакон, праз якія заглядала зелень дрэў і пышнасьць кветак, прамаўляў Прафэсар Рабэрт Оты й Апостальскі Дэлегат у Вялікабрытаніі Арцыбіскуп Дамінік Энрычы. Тады ўсе перайшлі ў яшчэ большую, перапоўненую гасьцьмі (больш за сто чалавек) залю. Тут з прамовамі выступалі: Заступнік Бургмістра Фінчлей і Барнэт сп. Фрыдман, ад Англа-Беларускага Таварыства ягоны старшыня Обэрон Гэрбэрт, ад Беларускіх арганізацыяў Канады др. Раіса Жук-Грышкевіч, ад ЗБВБ старшыня Ян Міхалюк, ад беларускіх арганізацыяў Францыі старшыня „Хаўрусу" мастак М. Наўмовіч. Наапошку прамаўляў заснавальнік і гаспадар Беларускай Бібліятэкі й Музэю Франьцішка Скарыны Яго Дастойнасьць Біскуп Часлаў Сіповіч. У сваёй патрыятычнай прамове ён дзякаваў Богу й усім тым, што працаю і чым толькі маглі дапамаглі й спрычыніліся да таго, што мы сяньня маем Беларускую Бібліятэку й Музэй за межамі Беларусі. Ён вітаў і дзякаваў шматнацыянальным гасьцём, што сваёй дастойнай прысутнасьцю ўшанавалі гэтак важную для нас урачыстасьць. Сярод гасьцей былі дастойнікі розных веравызнаньняў, навуковыя сілы, як прафэсары й лектары ангельскіх унівэрсытэтаў, мастакі, літаратары, журналістыя, прадстаўнік Брытыйскага Музэю, які ў сваіх сховах мае кнігі нашага Скарыны, сябра Парлямэнту, прынцы, лёрды, графы, палітычныя й грамадзкія дзеячы розных нацыянальнасьцяў, прадстаўнікі банку й прэсы.

Ад беларускіх арганізацыяў, апрача зь Вялікабрытаніі, былі прадстаўнікі з Францыі, Нямеччыны й Канады. Апрача таго, Управа ББіМ ФС атрымала пісьмовыя прывітаньні абсалютна ад усіх беларускіх асяродкаў вольнага сьвету, ды безьліч прывітальных лістоў ад розных іншанацыянальных асоб і установаў.

Пасьля афіцыйнае часткі прысутныя былі запрошаныя ў буфэт. Віно на падносах разносілі й частавалі гасьцей вучні Беларускае Школы Сьв. Кірылы Тураўскага. Іхнія багата вышытыя беларускім арнамэнтам нацыянальныя кашулі дасканала гарманізавалі з афіцыйнай вопраткай біскупаў і пралатаў, з тогамі акадэмікаў ды наканец туалетамі дам. А сталы із стравамі — гэта мастацтва само ў сабе. Яно старанна было аблічанае на падвойны эфэкт: зрокавы й смакавы. Ды трэба адмеціць, што наагул усё ўладжаньне ў Бібліятэцы й Музэі, нат у найдрабнейшых дэталях здраджае чулае на эстэтыку вока й дбайлівую ўмелую руку. Час ад часу абвешчаны быў адыход нейкага дастойнага гасьця. На перапоўненай сьпярша залі зрабілася вальней. І хлапцы ў нацыянальных беларускіх кашулях, што частавалі нас віном, цяпер пад кіраўніцтвам сп. Г. Пікарды пачаставалі нас такім канцэртам беларускіх народных песень, што цяпло, туга й радасьць разьлілася па душы.

Наступны дзень 16 травеня прысьвечаны быў вылучна для Беларусаў. Раніцай у царкве Сьвятых Апосталаў Пятра й Паўла Яго Дастойнасьць Уладыка Часлаў у суслужэньні з Айцамі Язэпам Гэрмановічам і Аляксандрам Надсонам ды двума прыслужнікамі (вучні беларускае школы) адпраўляў Сьв. Літургію. Сьпяваў хор пад кіраўніцтвам сп. Г. Пікарды. Апостала чытаў пабеларуску назьдзіў прыгожай вымовай вучань школы Сьв. Кірылы Тураўскага Марак Саўка-Міхальскі. Казань Уладыкі Часлава была прысьвечаная Франьцішку Скарыну, які ня толькі быў вялікім вучоным ды гуманістым заходняэўрапейскага маштабу, але перадусім чалавекам глыбака рэлігійным, што перакладаў сьвятыя кнігі на родны „язык", у якім „міласьцівы Бог" яго „на сьвет пусьціў", ды патрыётам свае Бацькаўшчыны.

„Магутны Божа" ў Лёндане сьпявае хор неяк інакш, прыцішаным, насычаным пачуцьцём голасам, быццам сьпеў быў прызначаны не для людзкога, а боскага вуха, быццам ціхая малітва трапляла да Госпада хутчэй, як галосная.

Пасьля Багаслужбы ў чытальні Бібліятэкі адбыліся тры даклады: Айца Аляксандра Надсана — „Сучасны стан беларускай бібліяграфіі", сп. Г. Пікарды — „Беларусіка ў розных бібліятэках Эўропы" і Р. Жук-Грышкевіч аб беларускім арганізацыйным жыцьці ў Канадзе. Пасьля дакладаў супольны абед, супольная бяседа, супольная песьня.

Аб гісторыі, арганізацыі, выглядзе каштоўных зборaў рэдкіх і меней рэдкіх кніг, часапісаў, газэт, мікрафільмаў, экспанатаў Беларускае Бібліятэкі й Музэю вобразна й дакладна інфармуе цікава напісаная паангельску, эстэтычна выдадзеная кніжыца „Беларуская Бібліятэка й Музэй Францішка Скарыны". Кніжыца выдадзеная была з нагоды адкрыцьця ББіМ, ейны аўтар — Ганаровы Сакратар Англа-Беларускага Таварыства сп. Гай дэ Пікарда. Удзельнікі сьвяткаваньня атрымалі яе на памятку гістарычнае падзеі, а чытач „Беларуса" можа набыць яе ў мясцовай беларускай арганізацыі.

Скажым тут толькі, што ББіМ ФС у сваіх каштоўных зборах мае між іншага 15 кніг, фатаграфічнае рэпрадукцыі, Франьцішка Скарыны выдадзеных ім у Празе (1517-1519) і Вільні (1525), такой-жа рэпрадукцыі Літоўскі Статут (1588), выданьня Братоў Мамонічаў у Вільні, значны збор рэдкіх беларускіх кніг канца 19-га й пачатку 20-га стагодзьдзя, багатыя зборы навейшых кніг, 220 комплетаў беларускіх газэт і часапісаў, каля 100 старых картаў Беларусі, шмат мікрафільмаў і дасканалы апарат да чытаньня іх, а між цікавымі экспанатамі музэю арыгінальныя Слуцкія й Гарадзенскія паясы.

Пратаўжэньнем урачыстасьцяў адкрыцьця ББіМФС, хоць не ў дасловным гэтага слова значаньні, але асабліва для гасьцей здалёк, была лекцыя Прафэсара Джэймс Дынглей (унівэрсытэт у Рыдынг) — „Войска Вялікага Княства Літоўскага ў 16-тым стагодзьдзі". Фактычна была гэта 5-я з чаргі лекцыя Курсу Беларусаведы 1970-1971 акадэмічнага году. Гадавыя Курсы Баларусаведы, якія стаяць на высокім акадэмічным узроўні, арганізуе ўжо пяты год Англа-Беларускае Таварыства. Лекцыі адбываюцца ў элегантнай залі Бэрлінгтон Дому на Пікадылі. Англа-Беларускае Таварыства, ачоленае Лёрдам Гарлех, пад старшынствам Обэрон Гэрбэрта выдае ад 1965 г. паангельску „Журнал Беларусаведы", сябры яго, ня толькі Беларусы, працуюць над разьвіцьцём ББіМФС. Такім чынам Англа-Беларускае Таварыства робіць вельмі паважны ўклад ў галіну беларускае навукі й культуры ды ўзаемна дапаўняе дзейнасьць БІНіМ у Амэрыцы, публікацыі якога, „Запысы", выходзяць пабеларуску.

На заканьчэньне выказваючы прызнаньне й пажаданьні плённай працы Заснавальнікам і Будаўнікам Беларускае Бібліятэкі й Музэю Францішка Скарыны ў Лёндане, так і хочацца выразіць надзею з пажаданьнем: Да спатканьня на адкрыцьці Беларускай Бібліятэкі й Музэю ў Амэрыцы.

Раіса Жук-Грышкевіч

Будынак Беларускай Бібліятэкі й Музэю Францішка Скарыны ў Лёндане

6-ТЫ ЗЬЕЗД ПІСЬМЕНЬНІКАЎ БЕЛАРУСІ (I)

6-ы зьезд пісьменьнікаў Беларусі, што адбываўся 26-27 сакавіка сёлета, як і трэба было спадзявацца, быў падрыхтаваны й праведзены ў духу партыйных дырэктываў, выказаных на XXVII зьезьдзе КПБ і XXIV зьезьдзе КПСС, і ў вадпаведнасьці з гэтым займаўся ня гэтулькі пытаньнямі літаратурна-мастацкімі, колькі ідэйна-палітычнымі. Палітычны аспэкт зьезду выразіўся ўжо ў ягонай арганізацыйнай структуры.

На папярэднім пятым пісьменьніцкім зьезьдзе ў травені 66-га году, апрача агульнага справаздачнага дакладу праўленьня Саюзу пісьменьнікаў, зробленага ягоным старшынём Пятрусём Броўкам, было аж пяць судакладаў пра паасобныя літаратурныя жанры: Івана Навуменкі пра мастацкую прозу, Максіма Лужаніна пра паэзію, Андрэя Макаёнка пра драматургію, Янкі Казекі пра літаратурную крытыку й Эдзі Агняцьвет пра дзіцячую літаратуру. Судаклады гэтыя мелі глыбокі прафэсійны характар, бо чыталі іх самі прадстаўнікі гэтых жанраў. Затое на 6-ым пісьменьніцкім зьезьдзе ўсе гэтыя пытаньні былі ахопленыя адным справаздачным дакладам першага сакратара Саюзу пісьменьнікаў **Максіма Танка**. Гэткае сканцэнтраваньне ўсіх пытаньняў у вадным дакладзе вылучала магчымасьць глыбейшага пранікненьня ў мастацкую спэцыфіку ўсіх жанраў, затое было яно выгаднае для палітычных абагульненьняў і высноваў.

Калі на зьездах розных творчых саюзаў ад ЦК КПБ звычайна прысутнічае й выступае з прамовай сакратар ЦК ў галіне ідэялёгіі й культуры, дык на 6-ым пісьменьніцкім зьезьдзе прысутнічаў сам першы сакратар ЦК КПБ **П. Машэраў**, што паказвала на асаблівую ўвагу партыі да пытаньняў літаратуры. І выступіў ён на зьезьдзе не з прамовай, а з абшырным дакладам, у якім даў партыйную ацэну сучаснай літаратуры й абвесьціў галоўныя партыйныя дырэктывы, што маюць цяпер абавязваць пісьменьнікаў.

Не зважаючы на старанную падрыхтоўку й праведзеную ў газэце „Літаратура і Мастацтва" перадзьвездаўскую дыскусію, Зьезд аднак ня выявіў адназгоднасьці ў паглядах пісьменьнікаў на існасьць і заданьні літаратурнай творчасьці дый наагул ня выклікаў глыбокага зацікаўленьня з боку пісьменьніцкага грамадзтва. На папярэднім зьезьдзе пяць год таму, калі ў Саюзе пісьменьнікаў было на 65 сяброў менш, чымся сяньня, выступала, улучна з дакладчыкам і судакладчыкамі, 27 пісьменьнікаў Беларусі, дык на 6-ым зьезьдзе выступала ўжо ўсяго 18 пісьменьнікаў. Як на арганізацыю, што задзіночвае сяньня ў сваіх радох каля 300 пісьменьнікаў, гэта станоўча за мала. Гэткі мізэрны ўдзел пісьменьнікаў у дэбатах зьезду паказвае на малое іхнае зацікаўленьне зьездам, на якім нельга было нічога сказаць, што пярэчыла-б партыйным дырэктывам, а гаварыць у духу партыйных патрабаваньняў ня было ахвоты.

Калі ня браць увагі на самога дакладчыка, што выступаў ад імя праўленьня Саюзу пісьменьнікаў, ды на прамову на афіцыйнае адчыненьне зьезду найстарэйшага векам заслужанага пісьменьніка **Кандрата Крапівы**, дык з гэных 16-ёх пісьменьнікаў, што выступалі на зьезьдзе, трохі больш за палавіну гаварылі ў духу партыйных дырэктываў. Гэта ведамыя партыйныя актывістыя ў беларускай літаратуры **Пятрусь Броўка, Кастусь Кірэенка, Павал Кавалёў, Еўдакія Лось, Іван Шамякін, Павал Дзюбайла, Уладзімер Карпаў, Леанід Прокша, Хведар Жычка, Іван Новікаў** ды расейскі сябра Саюзу **Аляксандар Міронаў**. Нічога новага ў пытаньнях літаратурна-мастацкіх пісьменьнікі гэтыя не сказалі: іхныя прамовы былі разгорнутымі паўтарэньнямі партыйных дырэктываў.

Усяго толькі сямёх пісьменьнікаў, што выступалі ў дыскусіі, засярэджваліся на пытаньнях творчых і чыста літаратурных. Гэтак **Алесь Асіпенка** надаў асаблівую вайстрыню актуальнаму пытаньню, што ў той час, калі павялічваецца колькасна пісьменьніцкая сям'я й расьце творчая прадуктыўнасьць шмат якіх пісьменьнікаў, дык выдавецкія магчымасьці для беларускае літаратуры ўсьцяж звужаюцца. **Уладзімер Юрэвіч** падчыркнуў ненармальную на ягоную думку зьяву адрыву беларускіх пісьменьнікаў ад літаратурнае спадчыны парэвалюцыйнага пэрыяду. **Ніл Гілевіч** паказаў на канкрэтных прыкладах і статыстычных дадзеных вялікае адставаньне ў галіне перакладаў на беларускую мову твораў чужых літаратураў. **Віктар Каваленка** скардзіўся на няспрыяльныя абставіны для разьвіцьця літаратурнае крытыкі. Спэцыфіцы дзіцячай літаратуры прысьвяціў сваё выступленьне **Васіль Вітка** ды зьвярнуў увагу на перашкоды, што стаяць на дарозе для ейнага росту. **Іван Мележ** гаварыў пра патрэбу павышэньня агульнай культуры сярод пісьменьнікаў

У гэтых колькіх выступленьнях на чыста літаратурныя й творчыя тэмы бадайшто вылучна падчыркваліся адмоўныя зьявы ў нашай літаратуры, што ад пісьменьнікаў зусім не залежаць, а створаныя абставінамі, у якіх змушаная разьвівацца беларуская літаратура.

Дыскусія зусім ня мела характару творчых спрэчак і вымены паглядаў на закранутыя ў ёй пытаньні. Але інакш і быць не магло, бо нельга-ж было аспрэчваць партыйных дырэктываў, як і нельга было таксама аспрэчваць адмоўных бакоў літаратурнага разьвіцьця, бо гэтыя адмоўныя бакі, пераважна не-

(Заканчэньне на 6 бачыне)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

ШТО ЧУВАЦЬ?

Украінская газэта „Свабода", што выдаецца ў Джэрзы Сыты, у нумары за 3 чырвеня сёлета зьмясьціла інфармацыю пад заг. „Бароняць права Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы ў вольным сьвеце", у якой спасылаецца на матар'ял нашае газэты (№169) у справе БАПЦ.

Першы сакратар ЦК КПБ Пётра Машэраў наракае на нястачу ў беларускім народзе энтузіязму да пабудовы камунізму ў сваёй сустрэчы з г. зв. „выбаршчыкамі" ў Вярхоўны Савет БССР (выбары адбыліся 13. VI. 71):

„Не сакрат, што сярод нашых людзей сустракаюцца яшчэ й такія, што ня вызначаюцца высокай сьвядомасьцю й не заўсёды могуць правільна распарадзіцца сваім вольным часам і ўсё большымі магчымасьцямі атрыманьня матар'яльных дабротаў. Нажаль, у такіх людзей, якія не атрымалі трывалай ідэйнай загартоўкі, не валодаюць унутранай культурай і добрымі эстэтычнымі густамі, нярэдка пад уплывам варожай буржуазнай прапаганды часам разьвіваюцца патрэбнасьці, якія ўступаюць у супярэчнасьць з нашай маральлю, усплывае нейкі рвацкі, набывальніцкі інстынкт, праяўляецца грэбаваньне сваім грамадзянскім і грамадзкім абавязкам". („Зьвязда", 1. VI. 71).

У канадзкім горадзе Манрэалі ад 5 да 8 травеня сёлета адбываўся міжнародны славянаведны сымпозіюм. У паасобных дакладах сымпозіюму закраналіся беспасярэдня беларусаведныя тэмы, як прыкладам у дакладзе праф. Освальда Бакуса на тэму прыгоннага сялянства Вялікага Княства Літоўскага ў 15-16 стагодзьдзях, праф. Рамана Кухара пра ўкраінскую й беларускую эміграцыйныя літаратуры, праф. Лёўэла Тылета на тэму „Хрушчоў і не-расейскія нацыянальнасьці" ды некаторых іншых.

Сымпозіюм быў арганізаваны супольна выкладчыкамі-славянаведамі ЗША і Канады.

Пісьменьнікі — гэта людзі, на якіх спадзявацца нельга", — прызнаўся савецкі прапагандысты Мікола Багун, памфлет якога, скіраваны супраць літаратурных перадачаў др. Ст. Станкевіча ў радыё „Свабода", быў перададзеныя радыястанцыяй „Савецкая Беларусь" 29 красавіка сёлета. Пісьменьнікі, бачыце, вы — Мікола Багун пра гэта даведаўся — „па прыродзе непадатлівыя, незгаворлівыя". І ці не затым якраз памфлетыстаму Багуну давялося прызнацца, што сярод беларускіх савецкіх пісьменьнікаў — тых, што слухаюць перадачы радыё „Свабода", ёсьць „адзінкі, што аказаліся падкімі на танную папулярнасьць".

Сёлета выходзіць упяршыню анталёгія беларускай паэзіі паангельску. Весткі пра гэта падаў інфармацыйны орган ЮНЭСКО „ЮНЭСКО ФІЧЭРС" № 596/597 (красавік 1971 году), выдаваны ў Парыжы. У лёнданскім выдавецтве „Алэн энд Анўін", паведаміў бюлетэнь „ЮНЭСКО ФІЧЭРС", друкуецца анталёгія беларускае паэзіі паангельску ў перакладзе ангельскае паэткі Веры Рыч. Вера Рыч ведамая таксама сваймі перакладамі з украінскае паэзіі. Анталёгія беларускае паэзіі мае загаловак „Як вада, як агонь". Цана кнігі — 4,5 ангельскія фунты.

У анталёгію ўвайшлі вершы беларускіх паэтаў 19-га стагодзьдзя Паўлюка Багрыма, Францішка Багушэвіча ды іншых, і 20-га стагодзьдзя, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Кандрата Крапівы.

Паведамляючы пра выхад у Лёндане анталёгіі беларускае паэзіі ў ангельскім перакладзе, бюлетэнь ЮНЭСКО падаў таксама кароткую даведку пра творчасьць Кандрата Крапівы, характарызуючы яго як прадаўжальніка традыцыяў Гогаля, Салтыкова-Шчадрына й Крылова. Як прыклад байкапісаньня Крапівы, у бюлетэні зьмешчаная байка „Сава, асёл і сонца" ў перакладзе Веры Рыч.

„У Беластоцкім ваяводзтве, — піша беластоцкая газэта „Ніва", — зямля знаходзіцца ў руках звыш 180 тысяч гаспадароў. Гэта іх уласнасьць". Прыватны спосаб апрацоўваньня зямлі, як відаць, дае добрыя вынікі. „У мінулым годзе, — піша „Ніва", — (ня гледзячы на няспрыяльныя ўмовы) сяляне Беласточчыны прадалі амаль 130 тонаў мяса й звыш 340 міліёнаў літраў малака. Дагэтуль яшчэ ніколі не ўдалося нашым хлебаробам даставіць дзяржаве такое колькасьці жывёлагадоўчых прадуктаў". Частка зямлі на Беласточчыне належыць таксама й да дзяржаўнага фонду. Затым аднак, што не стае працоўных рук і ахвоты, каб гэтую дзяржаўную зямлю належна апрацоўваць каапэратыўным спосабам, зямля зь дзяржаўных фондаў, піша газэта „Ніва", будзе прадавацца аднаасобным гаспадаром. Гэта найлепшы довад поўнага правалу калгаснае сыстэмы.

ГЕНЭРАЛ УБАРЭВІЧ

„З асяродзьдзя беларускага народу выйшлі вядомыя рэвалюцыянеры, палкаводцы, героі грамадзянскае вайны: ... І. П. Убарэвіч ..." (БелСЭ, т. 2, б. 267).

На савецкім адрыўным календары на 1971 год, (не падумайце, што на беларускім. Беларускага календара для Беларусаў Масква не дазваляе. — Рэд.), пад датаю 13 студзеня стаіць: „14 студзеня спаўняецца 75 год ад дня нараджэньня Гераніма Убарэвіча, савецкага ваеннага дзеяча". Зь Беларусяй Убарэвіч зьвязаны і сваім паходжаньнем і часткава сваёй бліскучай ваеннай кар'ерай, і да пэўнай ступені сваёй трагічнай сьмерцяй на 42-гім годзе жыцьця ў хвалях сталінскага тэрору. У часе ягонага арышту й пасьпешлівага расстрэлу, генэрал Убарэвіч быў галоўнакамандуючым Беларускае Ваеннае Акругі.

Хоць Гераніму Убарэвічу ня шмат давялося мець беспасярэдняга дачыненьня да станаўленьня беларускае савецкае дзяржаўнасьці — ягоны ваенны талент партыя выкарыстоўвала на іншых франтох грамадзянскае вайны — ведама аднак, што ён быў прыхільнікам ідэі нацыянальнае свабоды й дзяржаўнае сувэрэннасьці беларускага народу. Пра ўсё гэта, пэўна-ж, нічога ня кажа ані савецкі адрыўны календар, ані двутомавая „Гісторыя БССР" у сваіх абодвых выданьнях, як ня скажа мо й гэная пяцітомавая „Гісторыя БССР", з выданьнем якое ўжо цэлых дзесяць гадоў марудзіць Інстытут гісторыі АН БССР.

Акалічнасьці, у якіх генэрал Убарэвіч загінуў, дэталі тэрору 30-ых гадоў ды ягоныя глыбейшыя гістарычныя прычыны, не належаць да тых рэчаў, якімі савецкая гістарыяграфія й прапаганда любіць займацца.

За часамі Хрушчова, праўда, савецкія гісторыкі пачалі былі выцягваць на дзённае сьвятло змрочную рэчаіснасьць 25-цігадовага пэрыяду сталінскае самаволі й гвалту, што чыніліся ад імя партыі і ў імя ленінізму. Сёе-тое ў гэтым дэсталінізацыйным працэсе было сказана й пра Убарэвіча. Гэтак у другой частцы „Краткой истории СССР" АН СССР выданьня 1964 году чытаем: „На баявой сіле Чырвонай Арміі адмоўна адбіліся неабгрунтаваныя рэпрэсіі, якім былі паддадзеныя ў 1938-39 гадох ейныя найбольш дасьветчаныя ваенныя кадры. Зь віны Сталіна ў гэныя гады бязьвінна загінулі многія дасьветчаныя камандзеры й палітработнікі, а між імі слаўная пляяда выдатных ваеначальнікаў: Тугачэўскі, Блюхер, Убарэвіч, Якір, Уншліхт, Ягораў, Корк, Эйдэман ды іншыя". У гэтай-жа кнізе пра Убарэвіча кажацца, як пра аднаго з „праслаўленых герояў і палкаводцаў", што выйшлі з працоўнае гушчы народу.

І запраўды Убарэвічавы заслугі перад рэвалюцыяй былі вялізарныя. У гады грамадзянскае вайны партыя пасылала яго на самыя адказныя адрэзкі фронту. Калі ў верасьні 1919 году над арсэналам Чырвонае Арміі, Тулай, навісла пагроза збоку войскаў генэрала Дэнікіна, дык на прапанову Леніна Цэнтральны Камітэт партыі скіраваў супраць дэнікінцаў дадатковыя ваенныя рэзэрвы ў ліку 50 тысячаў салдатаў, і камандваньне гэтай арміяй даручыў 23-охгадоваму тады Убарэвічу.

Увесну 1920 году савецкі ўрад, каб ухіліцца ад вайны зь Японіяй, пастанавіў быў стварыць свайго роду „буфэрную" дзяржаву, гэтак зв. Далёкаўсходнюю Рэспубліку. Рэвалюцыйная арміяй гэтае рэспублікі спачатку камандваў Блюхер, а пасьля аж да кастрычніка 1922 году — Убарэвіч, і гэта ці не найбольш да яго датычацца радкі папулярнае сваім часам песьні партызанаў Прыамурскага краю „По долинам и по взгорьям" — пра „баявыя ночы Спаска, Валачаеўскія дні".

Убарэвіч быў ня толькі выдатным баявым камандзерам, але й ваенным тэарэтыкам, што разам з Блюхерам, Шапашнікавам ды іншымі зрабіў паважны ўклад у савецкую ваенную навуку.

Хрушчоў на 20-ым зьезьдзе партыі ў лютым 1956 году, у сваім шырака ведамым па цэлым сьвеце, хоць у Савецкім Саюзе й дагэтуль неапублікаваным выступленьні пра злачынствы сталінскага пэрыяду, прызнаўся: „Вельмі цяжкія вынікі, асабліва як пачалася вайна, прынесла зьнішчэньне Сталінам у 1937-41 гадох шмат якіх ваенных камандзераў у сувязі із Сталінавай падазронасьцяй і ў выніку паклёпніцкіх зьвінавачаньняў".

Яшчэ ў 1954 годзе Прэзыдыюм ЦК партыі, разгледзеўшы пытаньне рэгабілітацыі нявінна загубленых у пару яжоўшчыны ваенных дзеячоў, у тым ліку й Убарэвіча, сьцьвердзіў, што яны, як кажацца ў згадванай ужо „Кароткай гісторыі СССР" 1964 году выданьня, „ніякіх праступстваў супраць партыі й дзяржавы не зрабілі". Гэтак і просяцца тут дапаўняльныя словы: „Партыя й дзяржава зрабілі праступства супраць іх".

Пра Убарэвіча, пра якога маўчыць „Большая Советская Энциклопедия" ў сваім 2-гім выданьні, адрыўны каляндарык цяпер кажа: „Тры ордэны Чырвонага Сьцягу, Пачэсная залатая зброя — гэткія ўзнагароды Айчыны адважнаму камандзеру ў гады Грамадзянскае вайны".

Сяньня ў 75-ыя ўгодкі ад нараджэньня Убарэвіча нельга не паставіць сабе пытаньня: як магло дайсьці да таго, што бальшавіцкая рэвалюцыя, праведзеная ў імя справядлівасьці, брацтва, гуманізму па 20-ёх гадох абярнулася ў крывяжэрнага дракона, што паеў сваіх собскіх дзяцей? І затым слушна некаторыя кажуць, што каб будучыня ня была больш сьветкам падобных жудасьцяў, трэба перш-наперш даведацца праўду пра мінуўшчыну! Бо-ж і дагэтуль у савецкім грамадзтве мала хто ведае, што маршал Тугачэўскі, генэрал Убарэвіч ды іншыя ахвіцэры Чырвонае Арміі былі расстраляныя на аснове хвальшывых зьвінавачвальных дакумэнтаў , якія асабісты сакратар Сталіна Мехліс дастаў ад нацыстаўскіх агентаў у Бэрліне, куды Мехліс адмыслова лётаў у травені 1937 году.

Суд над Убарэвічам ды іншымі адбываўся за зачыненымі дзьвярыма, патаёмна, бязь ніякае публічнасьці. Сяньня, навучаныя трагічнай мінуўшчынай, мы добра бачым, што хаваецца за гэткімі судамі. Але й цяпер людзі ў Савецкім Саюзе ня ўпэўненыя, ці чыясьці падазронасьць або хвальшывыя зьвінавачаньні ня будуць выкарыстоўвацца ў будучыні, каб ізноў кагосьці пакараць нявінна, а пасьля рэгабілітаваць як героя на картачцы адрыўнога календара ...

Я. Запруднік

6-ТЫ ЗЬЕЗД ПІСЬМЕНЬНІКАЎ БЕЛАРУСІ (I)

(Заканчэньне з 5-ай бач.)

залежныя ад пісьменьнікаў, былі занадта відавочнымі й пераконлівымі.

Зьвяртала на сябе ўвагу поўная пасыўнасьць на зьезьдзе маладых пісьменьнікаў. Наймалодшыя ўдзельнікі дыскусіі **Ніл Гілевіч і Павал Дзюбайла** мелі па 40 год і да маладых пісьменьнікаў перасталі належаць ужо даўно. У сваім артыкуле пад вымоўным загалоўкам „Больш давяраць маладым", зьмешчаным у газэце „Літаратура і Мастацтва" за 15 студзеня сёлета пад рубрыкай „Насустрач 6-му пісьменьніцкаму зьезду", **Ніл Гілевіч** быў зьвярнуўшы ўвагу на ненармальную зьяву, што на 4-ым усесаюзным пісьменьніцкім зьезьдзе ў 67-ым годзе ня было нівводнага беларускага дэлегата ў веку да 40 год. Бадайшто ня лепш з выбранымі на зьезьдзе дэлегатамі на 5-ы ўсесаюзны пісьменьніцкі зьезд, у складзе якіх на дваццаць аднаго дэлегата адзін толькі **Іван Пташнікаў** мае 39 год, а ўсім іншым дэлегатам больш за 45 год. У нававыбраным на зьезьдзе праўленьні Саюзу пісьменьнікаў Беларусі, што складаецца з 65 асобаў, адно шасьцёх у веку ніжэй 40, але вышэй 30 гадоў: **Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Леанід Гаўрылкін, Анатоль Грачанікаў, Іван Пташнікаў і Барыс Сачанка.** Але ўсе яны ўжо таксама не належаць да маладых пісьменьнікаў.

Значыцца, вялікая колькасьць маладых пісьменьнікаў у веку ніжэй за 30 год, што ўжо даволі выявілі сябе, як здольныя, таланавітыя й плённыя пісьменьнікі, ня маюць ніводнага прадстаўніка ў праўленьні пісьменьніцкага саюзу, Гэта, трэба думаць, ня з прычыны няўвагі да маладых пісьменьнікаў, чаму пярэчыла-б асаблівая куліўасьць у галіне іхнага ідэйна-палітычнага ўзгадаваньня, а, відаць, таму, што спасярод маладых ніхто не знайшоўся даволі надзейным з палітычнага боку, каб быць уведзеным у склад праўленьня.

Маюць сваю вымову й праведзеныя на зьезьдзе некаторыя пэрсанальныя зьмены ў кіраўнічых органах пісьменьніцкага саюзу. Гэтак адзін з дасюлешніх сакратароў праўленьня Саюзу **Янка Брыль** заменены цяпер **Анатолем Грачанікавам.** Можна падумаць, што гэтае сваё становішча страціў **Янка Брыль** з прычыны свайго дакладу на пісьменьніцкім пленуме ў кастрычніку 68-га году, калі бязьлітасна скрытыкаваў бездапаможныя з мастацкага боку творы на рэкамандаваныя партыяй тэмы й праблемы. Таксама зьдзіўляе адсутнасьць у новым праўленьні **Уладзімера Дубоўкі,** далей **Анатоля Вярцінскага,** супраць якога выступаў у друку сакратар ЦК КПБ С. Пілатовіч, і **Нічыпара Пашкевіча,** які летась быў зьняты із становішча адказнага рэдактара газэты „Літаратура і Мастацтва". З нова ўведзеных у праўленьне Саюзу пісьменьнікаў бальшыня пісьменьнікаў, што апошнім часам задэманстравалі сваю асаблівую партыйную куліўасьць: **Анатоль Грачанікаў, Сяргей Грахоўскі, Хведар Жычка, Еўдакія Лось, Іван Новікаў, Васіль Хомчанка, Павал Дзюбайла й Леанід Прокша.**

Заміж спадзяванай аднадушнай маніфэстацыі на карысьць партыйнае палітыкі ў літаратуры, 6-ы зьезд пісьменьнікаў Беларусі гэткім ня стаўся. На ім, з аднаго боку, меў месца строгі партыйны наступ на літаратуру з мэтаю поўнага ейнага падпарадкаваньня партыі й прывярненьня ейнае службовае ролі, з другога боку, зьезд стаўся зыркім выявам наважанае, хоць пераважна й пасыўнае, абароны пісьменьнікамі сваіх літаратурных пазыцыяў. Пра гэтыя супярэчлівасьці зьезду яшчэ больш пасьветчылі справаздачны даклад праўленьня Саюзу пісьменьнікаў Беларусі й выступленьне першага сакратара ЦК КПБ **П. Машэрава,** пра што будзе ход у нашым наступным артыкуле.

Раман Шаруціч

РЭЗАЛЮЦЫЯ

Прынятая 14-ым Кангрэсам Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Нью Ёрку 30 травеня 1971 году

14-ы Кангрэс Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня, скліканы ў Нью Ёрку 30 травеня 1971 году, з пачуцьцём глыбокага задавальненьня сьцьвярджае выдатнае падтрыманьне шырокімі коламі Беларускага Грамадзтва ў Вольным Сьвеце газэты „Беларус", што й забясьпечыла ейны рэгулярны выхад на працягу апошніх васьмёх год. Бяручы на гэта ўвагу, 14-ы Кангрэс БАЗА выказвае шчырую падзяку ўсім тым беларускім арганізацыям і паасобным Суродзічам, што ахвотна памагалі газэце або творчым супрацоўніцтвам ў ёй, або грашовымі ахвярамі, або ў галіне распаўсюджваньня й пашырэньня газэты.

Асаблівую-ж падзяку 14-ы Кангрэс БАЗА выказвае сябром Рэдакцыйнае Калегіі „Беларуса", што самаахвярна й сыстэматычна працавалі пры рэдагаваньні газэты, пісаньні ў яе, выдаваньні й адміністраваньні, а таксама наступным беларускім арганізацыям ды Спадарыням і Спадаром, чыя дапамога газэце выражалася большымі разьмерамі й насіла сталы характар: а. Янку Абабурку (Ангельшчына), Міколу Абрамчыку, Праньцішу Бартулю Беларускаму Жаноцкаму Згуртаваньню ў Кліўленьдзе, Беларускаму Клюбу ў Манчэстары (Ангельшчына), Д-ру Анатолю Бразоўскаму (Аўстралія), Антону Бяленісу, пісьменьніку Юрку Віцьбічу, а. Віктару Войтанку, Д-ру Пётру Гайдзелю, Браніславу Даніловічу, Барысу Данілюку, Д-ру Янку Запруднікy, Д-ру Анатолю Занкавічу, Д-ру Раісе й Д-ру Вінцэнту Жук-Грышкевічам, Марыяну Каранеўскаму (Аўстралія), Сымону Полацкаму, Аляксандру Лашуку (Ангельшчына) Антону Маркевічу, Ваньдзе й Міхасю Махначом, Аляксандру Міцкевічу, Д-ру Уладзімеру Набагезу, Юзі й Чаславу Найдзюком, Міколу Нікану (Аўстралія), Вацлаву Пануцэвічу, Валі Пашкевіч, Д-ру Барысу Рагулі, Д-ру Вітаўту й Веры Рамуком, Васілю Русаку, Д-ру Язэпу Сажычу, Вячаславу Станкевічу, Д-ру Станіславу Станкевічу, Васілю Стому, Андрэю Стрэчаню, Д-ру Вітаўту Тумашу, Уладзімеру Шыманцу (Францыя).

З ЖЫЦЬЦЯ БЕЛАРУСАЎ КАЛІФОРНІІ

УДЗЕЛ У ХАРВАЦКІМ СЬВЯЦЕ

У нядзелю 18 красавіка сёлета ў залі Харвацкай Нацыянальнай Асацыяцыі ў Лёс Анджэлесе адбылося сьвяткаваньне 30-ых угодкаў абвешчаньня дзяржаўнае незалежнасьці Харваччыны.

На запросіны Міжклюбнага Камітэту Харвацкага Дня Незалежнасьці ганаровым госьцем ад Беларусаў на сьвяце быў Ч. Найдзюк. Нававыбраны старшыня арганізацыі Амэрыканцы за Свабоду Паняволеных Народаў Альгерд І. Клейнот (ён-жа старшыня Амэрыканскага Кангрэсу Палёніі на Каліфорнію й Арызону) сказаў ад імя ўсіх нацыянальнасьцяў прывітальную прамову ды заклікаў да адзінства ў змаганьні й абароне практычных ідэялаў незалежнасьці й свабоды.

НА ЎРАЧЫСТАСЬЦІ Ў ГОНАР НОВЫХ ГРАМАДЗЯНАЎ

У сыботу 15 травеня ў залі ведамага Галівудзкага Паляцыюм адбылася вялікая праграма, прысьвечаная прывітаньню новых натуралізаваных Амэрыканцаў. Арганізавалі ўрачыстасьць супольна Аддзел Адукацыі Дарослых Лёс-Анджэлескіх школаў і Жаноцкі Аддзел Фундацыі Свабодаў Вэклі Фоўдж. У багатай праграме надрукаваны быў даўгі сьпіс ведамых удзельнікаў урачыстасьці. Беларусаў у сьпісе прадстаўлялі сп-ва Юзя й Часлаў Найдзюкі. Усе ганаровыя госьці ад паасобных нацыянальнасьцяў былі прадстаўленыя прысутным кіраўніком цырымоніі сп-няй Антанэт Рыдзэўскай, старшынём усяе праграмы.

НА ВЫДАВЕЦКІ ФОНД „БЕЛАРУСА"

За папярэдні пэрыяд (месяц травень) паступілі ў касу нашае газэты падпіска й наступныя ахвяры на Выдавецкі Фонд „Беларуса":

1. Ад Беларусаў Канады:

1. Д-р Р. і Д-р В. Жук-Грышкевічы	$ 100.00
2. Д-р Б. Рагуля	50.00
3. Парахвія БАПЦ у Таронта	10.00
4. В. Прыстаўка	6.00
Усяго:	**166.00**

2. Ад Беларусаў Аўстраліі:

1. Д-р А. Бразоўскі, ад Беларусаў Заходняй Аўстраліі	55.00
2. П. Трысмакоў	6.32
Усяго:	**61.32**

3. Прыслана беспасярэдня ў Рэдакцыю ад Суродзічаў США:

1. Д-р П. Гайдзель	75.00
2. Ул. Курыла	60.00
3. В. і М.	20.00
4. Д-р А. Занкавіч	20.00
5. Я. Каханоўская	10.00
6. Г. П.	10.00
7. П. Драздоўскі	10.00
8. Н. Арсеньнева	10.00
9. Г. Орса	10.00
10. В. Грышчук	2.50
Усяго:	**227.50**
Усяго разам:	**$ 454.82**

Усім тым, што прыслалі грошы, Рэдакцыйная Калегія „Беларуса" выказвае шчырае беларускае дзякуй!

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011